Новы Час 25 студзеня 2019 | № 3 (614) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №1

Літаратурная Беларусь

Выпуск №1 (149)
(студзень)


КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Пасля нябыту: Зміцер Жылуновіч

Зміцер Хведаравіч Жылуновіч... Ён жа — Капылянін, Сымон Друк, Авадзень, Цішка Гартны. Паэт, празаік, перакладчык, журналіст. Мастацкі вобраз аўтара «Маніхвэста Часовага рабоча-сялянскага ўраду Беларусі», абвешчанага 1 студзеня 1919 года, стварыў у сваёй дакументальнай аповесці «Без эпітафіі» (1989) Эрнест ЯЛУГІН.



Фота Юліі Брожынай

Адзіны ў Беларусі памятны знак, усталяваны ў гонар Зміцера Жылуновіча (Цішкі Гартнага) у 2000 годзе каля Капыльскага раённага краязнаўчага музея. Грошы былі сабраныя гараджанамі на суботніках, а стварыў яго мясцовы скульптар Уладзімір Бандарэнка.

Пісьменнік распавёў нам пра сваю працу над біяграфіяй кіраўніка першага ўрада БССР, акадэміка АН БССР.

— Эрнест Васільевіч, Зміцер Жылуновіч блізкі Вам як публіцыст, рэдактар газеты і часопіса. Што падштурхнула даследваць яго жыццё і дзейнасць? Якія абставіны і асобы паспрыялі ў стварэнні кнігі пра яго?

— У канцы 80-тых гадоў я працаваў адказным сакратаром часопіса «Нёман». Полацкіх чытачоў зацікавілі мае эсэ пра Мікалая Улашчыка і Адама Мальдзіса ў кнізе «Толькі камні», і ў рэдакцыі мне даручылі напісаць пра Жылуновіча да 100-годдзя з яго дня народзінаў. Мне паспрыяў Аляксей Кароль, які працаваў у Інстытуце гісторыі партыі. Праз яго я атрымаў доступ да дакументаў пра допыты. Падзяліліся сваімі знаходкамі Віталь Скалабан, аўтар дысертацыі пра дзейнасць Беларускага Нацыянальнага Камісарыята, і У. Д. Якутаў — аўтар прац пра Аляксандра Чарвякова. Багаты гісторыка-літаратурны і чалавеказнаўчы матэрыял быў сабраны ў кнізе «Успаміны пра Цішку Гартнага», укладальнікамі якой была дачка пісьменніка, кандыдат філалагічных навук Г. З. Жылуновіч і вядомы зямляк Гартнага, доктар гістарычных навук С. Х. Александровіч.

Першы варыянт кнігі на рускай мове быў надрукаваны ў часопісе «Нёман» пад назвай «После небытия». Яе прызналі наватарскай. Мне важна было паказаць, што зрабіў Зміцер Жылуновіч як дзяржаўны дзеяч. Кніга выходзіла ў СССР вялікім накладам. Калі ўтварылася Рэспубліка Беларусь з ідэяй незалежнасці, узнятая тэма стала яшчэ больш актуальнай.

Ну а пра публіцыстыку і газету... У свой час, калі Ніл Гілевіч і Алег Трусаў запрасілі мяне да рэдактарства ў «Нашым слове», я зразумеў, якой важнай з'яўляецца газета як калектыўны арганізатар і натхняльнік...

Акрама таго, я знайшоў месца, дзе пахаваны Жылуновіч.

— Як гэта адбылося?

— Я тройчы наведваў Магілёўскую псіхалякарню, дзе некалі знаходзіўся Жылуновіч. Я знайшоў трох сведак, якія распавялі мне пра падзеі 1937 года: урача і дзвюх санітарак шпіталя. Адна з санітарак па прозвішчы Звяркова была маладой дзяўчынай у той час. Яна трапіла туды за сваім бацькам, таму што сям'ю раскулачылі і бацька звар'яцеў ад роспачы, а маці і маленькае дзіця выкінулі на вуліцу, і ніхто не даваў ім прытулку. Старэйшая дзяўчынка прабілася да свайго бацькі і працавала ў шпіталі санітаркай.

Урэшце, бацька Звярковай памёр, і яго пахавалі ў той яме, дзе і Змітра Жылуновіча. Яна прыходзіла туды наведваць свайго бацьку. Яна і паказала мне гэта месца, бо выдатна яго ведала. Калі я быў удзельнікам здымачнай групы дакументальнага фільма па маёй кніжцы «Без эпітафіі», то сведкаў знялі на кінакамеру. (Каля 25 гадоў фільм паказваюць па тэлебачанні.) Сведкі паведамілі, што былі там і бачылі мёртвага Жылуновіча. У іх у той час была ўзята падпіска пра неразгалошванне. Афіцыйнай версіяй лекараў была гангрэна лёгкіх, але ёсць меркаванне, што гэта было самагубства.

Жылуновічу спецыяльна дазвалялася прыходзіць у кантору і чытаць газеты. Калі ён даведаўся, што ў Маскве ідзе суд над нацдэмамі, ён зразумеў, што яго можа чакаць такі ж лёс. Каб пазбегнуць жорсткіх катаванняў, ён пайшоў на мужны ўчынак, бо не хацеў патрапіць сведкам на працэс, і не хацеў, каб знішчылі яго сям'ю. Жонку Надзею Сцяпанаўну, сына і дачку як сям'ю ворага народа проста выслалі з Беларусі і не дазволілі ім жыць у вялікіх гарадах; ім даводзілася цяжка. У асяроддзі вязняў ведалі, што Жылуновіч скончыў з сабой, гэта быў ягоны апошні мужны ўчынак, бо ён ратаваў і сваю рэпутацыю, і сваю сям'ю.

У 1925 годзе Жылуновіч вязе ў Берлін дзвесце тысяч марак і два пуды рукапісаў, каб выпусціць у свет падручнікі на беларускай мове і некалькі томікаў беларускага прыгожага пісьменства

У другое выданне кнігі, падрыхтаванае для «Мастацкай літаратуры», я дадаў усе новыя звесткі. Але яно, на жаль, не выйшла.

— У кнізе Вы паказалі Жылуновіча ў розных перыядах жыцця: маладым гарбаром з Капыля, потым — карэспандэнтам «Нашай Нівы», рэдактарам «Дзянніцы», сакратаром Беларускага Нацыянальнага Камісарыята, кіраўніком першага ўрада БССР і руплівым Дзяржвыдавецтва БССР.

— У мяне была задача не зрабіць гістарычную бухгалтэрыю, а стварыць вобраз. Я шукаю сацыяльныя і псіхалагічныя прычыны кожнай з'явы ў гісторыі. Я натхніў Генрыха Далідовіча, і ён у сваіх публікацыях развіў гэту тэму, быў маім пераемнікам.

— Жылуновіч схіліўся да бальшавікоў. Чаму так здарылася?

— Калі прачытаць іх праграму, яны абяцалі перадаць зямлю рабочым і сялянам, запэўнівалі, што рабочыя на заводах будуць самі выбіраць сваё кіраўніцтва і частку прыбытку размяркоўваць паміж сабой. Бальшавікам удалося пераканаць народ, што яны зробяць лепшым жыццё. У той жа час дзеячы БНР не маглі згуртавацца, спрачаліся паміж сабой.

— Вы стварылі рознапланавы партрэт Цішкі Гартнага...

— Ён заўсёды сачыў за сваім знешнім выглядам, любіў прыгожа апранацца. Як толькі дазволілі ўмовы, купіў шэры франтаваты касцюм-тройку. Насіў белыя накрухмаленыя каўнерыкі, гальштук-матылёк, велюравы капялюш з вузкімі палямі, прывезены з Германіі. У Капыль ён прыязджаў заўсёды ў самым лепшым касцюме, падарункі прывозіў не толькі радні, але і суседзям, дзяцей частаваў цукеркамі, пернікамі. Многім гэта падабалася.

А нехта цішком зайздросціў. Так з'явіўся данос у ЦК. На першым плане фігуравала тое, што Жылуновіч прымаў удзел у пахаванні свайго швагра з царкоўнымі ўшанаваннямі, а следам — што быў апрануты па-буржуйску, нават пачапіў гальштук.

У чэрвені 1924-га яго на год выключаць з партыі — «за адарванасць ад мас і абывацельскую псіхалогію».

У 1925 годзе Жылуновіч вязе ў Берлін дзвесце тысяч марак і два пуды рукапісаў, каб выпусціць у свет падручнікі на беларускай мове і некалькі томікаў беларускага прыгожага пісьменства. Ён узначальвае Дзяржаўнае выдавецтва БССР, актывізуе выдавецкую працу, рупіцца пра паліграфічнае забеспячэнне...

А ў 1928-ым ён становіцца правадзейным членам Інбелкульта. У 1934—1936 гадах працуе ў Інстытуце гісторыі БелАН, чытае лекцыі па гісторыі Беларусі... У сваю кніжку я ўключыў і вершы Змітра Жылуновіча.

— У БССР да выхаду Вашай кнігі не было поўнай праўдзівай публікацыі пра лёс кіраўніка яе першага ўрада. Гэта сведчыць пра рэпрэсіўны характар савецкай сістэмы?

— Калі не ўдалося рэалізаваць ідэю БНР, Жылуновіч і Чарвякоў думалі пра тое, што трэба падтрымаць БССР, таму што незалежнай была абвешчана не толькі асобная вобласць, а ўся краіна, хаця і ў форме савецкай рэспублікі. Інстынктыўна яны разумелі, што ні адна імперыя не ўтрымліваецца вельмі доўга, у іх было спадзяванне, што наперадзе будзе нешта лепшае, як пісалі: «Загляне сонца і ў наша ваконца».

Зміцер Жылуновіч спадзяваўся, што калі абвешчана нацыянальная рэспубліка, то з цягам часу пачнуць выкладаць усе прадметы на беларускай мове ў школах, будзе працаваць у кожным горадзе нацыянальны тэатр, возьмецца за культурную справу інтэлігенцыя і будзе створаны нацыянальны друк.

Гутарыла Эла Дзвінская

Анталогія «Eurozine» з беларускім творам

Тое, што пачалося трыццаць пяць гадоў таму як нефармальная сустрэча еўрапейскіх рэдактараў, стала асновай для праекта «Eurozine», заснаванага ў 1998 годзе ў якасці онлайнавага культурніцкага часопіса і еўрапейскай сеткі рэдакцый часопісаў.

Каб адсвяткаваць юбілей, «Eurozine» выдаў адмысловую анталогію, якая ахоплівае праект храналагічна, тэматычна і геаграфічна. Кніга дае ўяўленне аб двух дзесяцігоддзях уцягнутасці ў самы цэнтр еўрапейскіх дыскусій. Ад новых нацыяналізмаў да Еўра-Ісламу, ад Парыжа і Прагі да свабоды слова і ролі інтэлігенцыі, ад алгарытмаў да палітыкі пост-праўды і маскулiннасці Уладзіміра Пуціна і Дональда Трампа, — зборнік тэкстаў, якія пашыраюць кантэкст.

Зборнік адкрываецца прадмовай сузаснавальнікаў «Eurozine» Карла-Хенрыка Фрэдрыксана і Клаўса Нэлена. Анталогія ўключае тэксты Славенкі Дракуліча, Яна-Вернера Мюлера, Іды Бёр'ель, Жака Рупніка, Цімаці Снайдара, Тацяны Журжэнка, Марсі Шор, Кенана Маліка, Нілюфер Гёле, Катрын Пасіг і Ахілла Мбембе. Беларусь прадстаўлена перакладам эсэ «Нічый Чарнобыль» Барыса Пятровіча.

Кніга ва ўсім свеце цяпер даступная праз «Eurozine». Аформіць заказ можна непасрэдна па электроннай пошце: office@eurozine.com.

Вось толькі два выказванні пра анталогію і сам праект «Eurozine»:

«Еўропа разрываецца на часткі. Тым не менш, адным са станоўчых наступстваў крызісу ў ЕС з'яўляецца тое, што еўрапейцы пачалі цікавіцца адно адным. Фінансавы крызіс прымусіў звычайных немцаў стаць экспертамі па эканоміцы Грэцыі і Італіі; міграцыйны крызіс зрабіў чэхаў і палякаў экспертамі па нямецкай сістэме прытулкаў. Карацей кажучы, адзіная еўрапейская публічная сфера ў цяперашні час больш рэальная, чым калі-небудзь раней. Калі і ёсць праект, які ўвасабляе ў сабе гэтую ідэю, то гэта «Eurozine». Што можа быць больш еўрапейскім, чым невялікі часопіс вялікіх ідэй? Калі б «Eurozine» не існаваў, яго трэба было б прыдумаць. Дзякуй Богу і наяўным заснавальнікам, ён ужо з намі» (Іван Крысцеў, «After Europe»);

««Eurozine» — лекі ад інтэлектуальнай астмы» (Ола Ларсмо, «Dagens Nyheter»).

Сетка еўрапейскіх культурніцкіх часопісаў «Eurozine» уключае ў сябе больш за 120 выданняў, у тым ліку — літаратурна-мастацкі часопіс «Дзеяслоў».

Ул. інф.

Мядовая прэмія

Літаратурную «Мядовую прэмію» за мінулы год, заснаваную ў 2001-ым берасцейскім паэтам і пчаляром Міколам Папекам, атрымаў з рук фундатара таленавіты берасцейскі паэт і тэлежурналіст Мікола Пракаповіч.

Пуд (вядро) мёду, а разам з ім адмысловы нагрудны знак і дыплом былі ўручаны яму за выдадзены Саюзам беларускіх пісьменнікаў у сталічным «Кнігазборы» зборнік вершаў «Прытулак памяці», а таксама аднайменную п'есу для батлейкі. Ганараванне прайшло ў Культурна-адукацыйным цэнтры «Вясковы рэнесанс» аграсядзібы «Стулы», што ў Пружанскім раёне, на ўскрайку Белавежскай пушчы.

Сядзіба Аляксандра і Ларысы Быцко для правядзення святочнай імпрэзы была выбрана не выпадкова. Менавіта тут у красавіку мінулага года пры самым актыўным удзеле саміх гаспадароў, якія выступілі ў якасці артыстаў-лялечнікаў, упершыню быў пастаўлены батлеечны спектакль «Прытулак памяці» па п'есе Міколы Пракаповіча. Пастаноўка мела добры розгалас і заахвоціла Ларысу і Аляксандра яшчэ з большай сілай прапагандаваць сваё, роднае. Па словах прыветнай гаспадыні, цяпер пасля двух-трох гадзін знаходжання ў адукацыйным цэнтры нават гарадскія дзеці пачынаюць размаўляць па-беларуску.

Перадсвяточная вечарына ў «Стулах», якая (нягледзячы на снежную замець і бездарожжа) сабрала больш за паўсотню гасцей, адкрылася прэм'ерай «Палескай батлейкі», прысвечанай памяці вядомага земляка, дыялектолага, перакладчыка на заходнепалескую гаворку «Новага запавета» Фёдара Клімчука.

Літаратурную частку сустрэчы вёў кіраўнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў Мікола Аляхновіч. Ён заўважыў, што рэгіянальная літаратурная прэмія з кожным годам набывае ўсё большую вагу, згадаў імёны папярэдніх яе лаўрэатаў. На вялікі жаль, толькі за апошнія гады мы развіталіся з Алесем Каско (ён атрымаў «Мядовую» першым), Валянцінай Куксай, Кастусём Жмінько, Алесем Зайкам. Іх словы асабліва кранальна гучалі з экрана.

Добрыя словы пра творчасць Міколы Пракаповіча прамовілі яго сябры. У прыватнасці, мастак Мікалай Кузьміч адзначыў, што Пракаповіча-тэлежурналіста можна з поўным правам лічыць летапісцам культурнага жыцця Берасцейшчыны. Вядомая паэтэса Ярына Дашына выказала ўдзячнасць Міколу Пракаповічу як свайму літаратурнаму настаўніку. Мікола Папека жартам заўважыў, што «Мядовая прэмія» зачакалася паэтавага юбілею і ягонай новай кнігі.

У падмурку надзейна складзенага творцам паэтычнага дома ляжаць такія ключавыя паняцці, як Айчына, Сябрына, родная Мова. Якому сапраўднаму беларусу не вядомы кранальныя радкі Пракаповічавага верша «Запавет Васіля Цяпінскага»!

Жывы народ, пакуль жывое СЛОВА.
Крыніцаю з-пад глею і жарствы
адродзіцца праз ваш ратунак мова, —
адродзіцеся з роднай мовай вы!

Літаратурная імпрэза ў «Стулах» завяршылася аўтограф-сесіяй, святочнай — нягледзячы на тое, што посная — вячэрай і новымі цікавымі знаёмствамі.

Мікола Сянкевіч

«Я з палескага сяла...»

Міколу ПАЦЕЮКУ — 80

Мікола Пацяюк нарадзіўся 24 снежня 1938 года ў вёсцы Ляхаўцы Маларыцкага раёна. Служыў на флоце, закончыў Гродзенскае музычна-педагагічнае вучылішча і Брэсцкі педінстытут. Паводле слоў самога Мікалая Іванавіча, «тры гады бадзяўся па морах і акіянах і паўвеку слугаваў школе, дзецям, роднаму краю». Выдаў зборнікі вершаў «Мелодыя сэрца», «Душой не пакрывіць», «З-пад буслінага крыла». Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Словамі, вынесенымі ў загаловак, адкрываецца другі па ліку зборнік паэта. І гэта не скрушнае: «Прабачце, бо я з глухога палескага сяла!», а ўдзячнае, з гонарам: «Я сын гэтай зямлі! Мяне выгадавала палеская вёска!»

Бацька Міколы загінуў на вайне, хлопчык зведаў усё, што выпала на долю ягоных аднагодкаў, але сэрца будучага паэта не стала жорсткім, у ім нарадзілася і пасцілася здольнасць бачыць адметнае і прыгожае. Як у вершы пра першы снег:

Вішні белыя ў рады.
А па сцежцы ўздоўж садочка
З боку левага сляды,
З боку правага — слядочкі.

Міла, хораша... Адразу паўстае ва ўяўленні шчаслівая маці — за руку з гарэзным дзіцём.

Свой паэтычны аповед Мікола Пацяюк вядзе няспешна, вольна. Яго верш адрозніш нават зрокава: ён цэльны, няма падзелу на строфы. Радкі шырокія, амаль што на ўсю прастору старонкі. Думка не абрываецца пасярод радка, што надае вершу асаблівую напеўнасць. Гэта ў тым ліку і пра Міколу Пацеюка пісаў Уладзімір Караткевіч у сваім знакамітым нарысе «Зямля пад белымі крыламі»: «...Колькі паветра набрана ў лёгкія, столькі і аддадзена, шчодра, да апошняга, нават з лішнімі словамі, каб мелодыя сказа была завершана».

У Міколы Пацеюка мяккі народны гумар. Свой, не на ўзроўні анекдотаў. Паспрабуй не ўсміхнуцца, калі чытаеш:

Не пытайся ты, суседка, у мяне
Пра здароўе: тут прыцісне, там — кальне.

І ў ацэнцы сваіх паэтычных набыткаў паэт таксама іранічны:

Не майстар я славесных выкрунтасаў,
Мой верш не прэтэндуе на вякі;
Я ўсім, хто здольны падкаваць Пегаса,
Гатоў трымаць падковы і цвікі.

Вось каб усе, хто спрабуе нешта рыфмаваць, гэтак жа крытычна адносіліся да сваёй творчасці!..

Апошнім часам Мікола Пацяюк захапіўся перакладамі валынскіх паэтаў, неаднаразова друкаваўся ва ўкраінскім Луцку. Любімыя аўтары — Ніна Горык і Таццяна Якавенка. А яшчэ лёгка, на зайздрасць маладым, ён асвоіў камп'ютар, упэўнена адчувае сябе ў інтэрнэтпрасторы. Сваю жыццёвую пазіцыю паэт абазначыў наступнымі радкамі:

Не зачарсцвець, не скіснуць, не астыць,
Не пакрывацца цвіллю год ад году.
Бо для чаго тады, скажыце, жыць,
Калі ў жыцці не бачыць асалоду.

Творчага Вам і жыццёвага даўгалецця, шаноўны Мікалай Іванавіч!

Мікола Сянкевіч

Будзем чытаць «Дзеяслоў»!

Незалежны літаратурна-мастацкі часопіс «Дзеяслоў» выходзіць у Беларусі з верасня 2002 года. Неўзабаве з'явіцца яго 100-ы нумар!



За адносна кароткі час «Дзеяслоў» здолеў стаць папулярным і вядомым у краіне. Сёння ён — самае аўтарытэтнае літаратурна-мастацкае выданне Беларусі. Вакол «Дзеяслова» аб'ядноўваліся і аб'ядноўваюцца як знакамітыя пісьменнікі, так і самыя перспектыўныя маладыя аўтары.

«Дзеяслоў» — альтэрнатыва дзяржаўным літаратурна-мастацкім выданням, дзе ўстаноўлены ідэалагічная цэнзура і дзяржаўны кантроль над творамі і аўтарамі.

Нягледзячы на цяжкасці, часопіс зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь і выходзіць афіцыйна і рэгулярна — раз на два месяцы.

З 2005 года на часопіс можна падпісацца па ўсёй краіне праз дзяржаўнае Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта». Аднак праблемы з распаўсюдам застаюцца, бо дзяржаўныя манапалісты «Белсаюздрук» і «Белкніга» з надуманых прычынаў адмаўляюцца яго распаўсюджваць.

«Дзеяслоў» — адзіны ў краіне часопіс, які аб'ектыўна асвятляе літаратурна-мастацкі працэс, друкуе новыя творы беларускіх аўтараў (і пераклады замежных), якія не могуць быць апублікаваныя ў дзяржаўных выданнях.

Паводле водгукаў чытачоў, акрамя прозы і паэзіі заўсёды цікавая ў «Дзеяслове» эсэістыка, артыкулы на гістарычную тэматыку, публіцыстыка, літаратурная і мастацкая крытыка. Улічваючы тое, што ў Беларусі сёння няма беларускамоўных часопісаў, у якіх бы асвятляліся праблемы тэатра, кіно, музыкі, «Дзеяслоў» друкуе таксама артыкулы і на гэтыя тэмы.

Дзейнасць «Дзеяслова» накіраваная найперш на выжыванне ў краіне вольнага слова, беларускай літаратуры і культуры, на абарону права пісьменнікаў і журналістаў на свабоднае самавыяўленне, данясенне да чытачоў праўдзівай і аб'ектыўнай інфармацыі пра стан літаратуры і культуры.

Заснаваная рэдакцыяй «Дзеяслова» прэмія «Залаты апостраф», якая штогод прысуджаецца аўтарам у намінацыях «Паэзія», «Проза», «Дэбют», — адна з першых недзяржаўных літаратурных прэмій Беларусі.

Пазнаёміцца з навінамі «дзеяслоўнага» жыцця і публікацыямі можна не толькі ў папяровай версіі, але і на ягоным сайце dziejaslou.by.

Ну а калі з розных прычынаў не атрымалася падпісацца на часопіс, «Дзеяслоў» можна набыць у менскіх кнігарнях:


«Акадэмкніга» (пр. Незалежнасці, 72),

кнігарня «Логвінаў» (пр. Незалежнасці, 37а),

«Кніжная шафа» (пр. Дзяржынскага, 9, уваход з двара),

а таксама ў інтэрнэт-крамах knihi.by і prastora.by.

«Дзеяслоў» пачаў супрацу і з крамай Symbal.by (Менск, пр. Машэрава, 18). Цяпер яго можна замовіць і на сайце symbal.by — як у Беларусі, так і па ўсім свеце!



Знак памяці

Ідэя

На зыходзе леташняй зімы патэлефанаваў Валерый Бурэнь з Маладзечна:

— У ТБМ уступіў, каб мець падтрымку ў задуманым дзеянні.

У артыкуле «Іду да Драздовіча», змешчаным у кнізе «Праз церніі да зорак», ён распавёў, як не мог знайсці месца нараджэння славутага земляка і цяпер вырашыў дзейнічаць, каб пазначыць... Дык вось хоча прыехаць і паспрабаваць звярнуцца да ўладаў, большых і меншых. Якраз дарэчы — юбілей народзін мастака, 130-годдзе. Але ўжо даведаўся, што там — маладыя лесапасадкі, і ў яго «загуляла» ідэя...

— Каб не аднаму ісці — з дэлегацыяй, — так думаў і накіраваўся да нашай падсвільскай суполкі ТБМ, у прыватнасці, да мяне.

Дамовіліся сустрэцца на глыбоцкай станцыі. Ён — з Маладзечна. Я — з Падсвілля. Пачынаўся час абеду. І мы, прама ад чыгуначнага вакзала, пешкі, праз усё Глыбокае, да лясгаса шлёпалі па мокрым снезе. Прыйшлі і яшчэ чакалі.

Цяпер разумею, што паход у лясгас, да Сяргея Васільевіча Гайдука, быў правільным рашэннем. Заўсёды, перш, чым ісці ў кабінет выканкама, варта шырэй абвясціць ідэю. Можа, гэта і дапамагло ў «шыльдавай задуме»? Хай сабе ўсё крыху гумарыстычна і няўпэўнена, але — ад душы з натуральным удзелам, пяшчотным і пераканаўчым.

Да Гайдука і ад Гайдука

Малады начальнік — спадар Сяргей Гайдук — неяк спанталычана здзівіўся ў адказ на прапанову спадара Валерыя Бурэня назваць лесапасадкі ў Пуньках іменем Язэпа Драздовіча. І тым больш — уразіўся, калі дэлегат ТБМ сказаў: «На Горадзеншчыне малады лес назвалі іменем Васіля Быкава».

— Не разумею, чым прылягае Быкаў да лесу, — прыкладна так, з затоенай усмешкай, адказаў, і аж падскочылі бровы. Тут мне таксама падумалася: «Быкаў — можа й не. А ў Язэпа Драздовіча за хатай — лес. Зоркі гаварылі з ім над вершалінамі тых прысядзібных ліпаў». Дык лес шаптаў Язэпу,

Яму ўзмацнялі летуценне
Лясныя блікавыя цені,
І зоркі прамеж вершалін
Нябесна гутарылі з ім.
Правільна, што лес — імя!..

Валеры, прыкметна расхвалявана, дастаў з торбы важкі доказ — том «Праз церніі да зорак».

— Во тут яго творы і пра яго — беларускага «Леанарда да Вінчы», вартага ўшанавання, але вам прапаную прачытаць маленькую кніжку, для знаёмства, — сказаў адзін Васільевіч другому. Том «Ад церніяў...» доўга не затрымаўся на стале — вярнуўся ў торбу. А тоненькая кніжачка засталася ляжаць.

Спадар Гайдук заўважна скеміў, што ў намеры цёзкі па бацьку можа быць зярнятка...

Ён зычліва сказаў: «Ды мы ж зробім, калі дазволіць выканкам».

— Заяву туды панясем во цяпер, пасля абеду, — павесялела надзея на вуснах Бурэня...

У ідэалагічным аддзеле не пашанцавала на спатканне. Загадчыца была занятая экскурсіяй прадстаўнікоў прэзідэнцкай адміністрацыі. Нас рухава сустрэла ветлівая сакратарка. «Прапанова» легла на бліжэйшы стол. Чакаць было бессэнсоўна. А тут яшчэ думка пра цягнік.

І мы ўжо — бягом. На станцыю. Валер Васільевіч таксама ў Падсвілле. З Падсвілля зручней на Маладзечна.

Ён на развітанне ўручыў мне ўзнагароду за паплечніцтва — чорную рэдзьчыну з асірацелай бацькоўскай ляхі і кавалак торта — замарыць таго «чарвячка», які тачыў увесь дзень страўнік.

«Тыя» адгулялі

...Напачатку вясны Валерый Бурэнь атрымаў пісьмовую адмову ад першага намесніка старшыні райвыканкама І. І. Пачкоўскага: «...Прапанову назваць лясную пасадку, размешчаную на месцы сядзібы Язэпа Драздовіча з усталяваннем адпаведнага знака, лічым немэтазгодный».

І Валерый сцішыў сваю мару, мне нічога не кажучы.

А тут, у сярэднюю восень, званок ад яго:

— Нібы там Знак Памяці ўсталявалі? У Пуньках. Што-небудзь чулі? Я можа б вырваўся з работы на адкрыццё?..

— Не-е, а якая сёння дата? — злякнулася, бо дапісвала верш да юбілею. Але выявіла, што яшчэ тры дні ёсць, і абрадавалася, што гэтая навіна ці не апраўдвае тое наша падарожжа. Яно, выходзіць, не марнае... Трэба ў Мар'яна спраўдзіцца. І тэлефаную. Чую:

— Дык жа «тыя» ўжо адгулялі!

— Як адгулялі? Калі?

— Весела! І яшчэ на тым тыдні. Ты што, Марыя, не ведала? Афішу трэба чытаць! Менш пісаць, больш гуляць на паветры і прыглядацца! Плошча машынамі была застаўлена. Не ўгледзела?.. Канферэнцыя гучная. І ў Пуньках... У лесе адбылося. Дык ты ж лес любіш...

«Язэпе! — адчайна ўсклікнула душа, — і на тваім юбілеі раскол. Дык што рабіць? Кладу смех на душу — хай яна іскрыцца... Бач ты: «тыя». Мы, значыць, «гэтыя»? Дык «гэтыя» не ведаюць, што «тыя» робяць? У адносінах да агульнароднага беларускага Язэпа Драздовіча?..

А ў Пунькі сапраўды хацелася. І прыгадалася рэдзьчына... І куды яшчэ паляцела думка? Чамусьці да Вацлававіча (старшыні нашага сельсавета), да якога я хадзіла з просьбай паклапаціцца пра шыльду на будынку гэтай установы, каб на дзьвюх мовах... Пэўна ж ён быў у Пуньках і бачыў прыклад: на Язэпавай шыльдзе — беларускі тэкст? А ці беларускі? — раптам ушчамілася дурашлівая думка.

І зноў затаміла Язэпава святая ў «тых». Гэта ж трэба: якіх 500 метраў (няўжо больш?) ад майго дома адбылося... У ДК. І некалькі крокаў... ад запасной, «стратэгічнай», кватэры сябра ТБМ — Місевіча. Дык той і далягцеў — паспеў на канферэнцыю.

Люба кажа: «Чэсік завязе ў Пунькі ў Дзень юбілею, не хвалюйся, Марыя. Убачым, які там Знак!»

Мастак Купава задумаўся...

На могілках, дзе Язэп, дачакаліся ўсіх: і мастакоў, і Аду Райчонак, і Мар'яна, і Глыбачанаў (карэспандэнтаў-незалежнікаў), і новых — незнаёмцаў. Усяго 22 чалавекі. Дык з Пунькамі зноў што выйшла? Мікола Купава, які ўжо даўно марыць пра нейкую адметнасць на месцы сядзібы Драздовіча, пачуў маё паведамленне пра Знак (як ён пачынаўся). Пасля слова-ўспаміну паэткі Марыі Новікавай пра даўняе ўражанне (100-годдзе з Дня нараджэння мастака) Купава задумаўся і сказаў: «Хацелася б пабачыць тую шыльду на камяні».

— Ты за праважатага, Чэсь! — гукнуў Мар'ян, — а я на сядзібу — гаспадыня чакае.

Мы рушылі на Пунькі, але ззаду чамусьці прыстроілася толькі адна машына. Я заўважыла ў ёй Купаву... Праехаўшы нейкі адрэзак шляху, Чэсь спахапіўся спытаць, ці ведаюць нашы паслядоўнікі дарогу назад, да сядзібы Місевіча, бо астатнія туды ірванулі.

— Нам жа на цягнік трэба, назад да Мар'яна не паедзем... Не ведаеце? Ну, тады хутчэй, пакуль яшчэ хвост картэжа відаць, во па гэтай дарозе!

Так і не трапілі ў Пунькі...

Не блукаў ён — ішоў...

Пасля аналізу гэткіх падзей перада мной, уночы, разгарнулася містычная карціна: усё бачу і чую. Асабліва слыхам бяру.

Я — нічый, без патрэб
Па Ліплянах блукаю.
Я — Драздовіч Язэп...
«Вышыванку» шукаю...
Што маё захавана?..

Ну, з аднаго боку, — думаю, — кожны пра сваё рупіцца... Дык нейкая інтуіцыя падказвае, што «Вышыванка» — гэта кніга. Як нібы я калісьці чытала. Ды пры пісьменніцкім расколе павылятала ўсё з галавы — не помню аўтара. Але голас узмацніўся:

Я вас помню, а вы?..
Усё — вон з галавы?

Аж сам Язэп мільгнуў перад вачыма. Вось і не веру у той свет... — здзіўляюся, — Язэп сочыць... Збоку той нейкі аўтар верша паведамляе:

Задыхаўся і слеп...

Гэта Язэп слеп? — абураюся. — Ай-яй-яй! Не гавары так, паэт! Калі мастак і скардзіўся на зрок, дык толькі восеньскім адвячоркам, калі рана цямнела. У яго дальназоркасць развівалася. Ого, які дальназоркі Язэп! І запытайся ў Чэся Лубчонка з Наваполацка. Язэп жа яму, яшчэ школьніку-пачаткоўцу, графічна занатаваў зімовы малюнак. Тады Драздовіч жыў два тыдні ў бацькі Чэся — пуцявога рабочага на чыгунцы. І той пазней вельмі журыўся, што памірае мастак у Падсвільскай бальніцы. «Ці закурыць, ці нешта смачнае, прыгатаванае мамай, насіў яму, — згадвае Часлаў. Дык жа не сляпы быў Драздовіч. І памёр не ад задышкі.»

І тут мне ў вуха разанула апраўданне:

Не пісаў бы, што слеп,
Дык жа рыфму дзе ўзяць?
Бо не Восіп — Язэп —
Тут праблема уся!

І адказ чую з сябе, знутры:

Нам, дык сёння — на здзіў
Рух яго: дзе хадзіў...
Не блукаў без патрэб
Ля кустоў і ля рэк.
Не блукаў ён — ішоў!
Не на возера Шо, —
На нябёсы, да зор —
Нёс прамыслены твор.
Ён пытаўся — у зор:
«А ці якасны твор
Для нябесных патрэб?».
Дзейна-мройны Язэп
Мог і жыць толькі так,
Як аб'ёмны дзівак.
Зорку сноў запаліў...
І з падсвільскай зямлі
Карані яго мар
Так шырока пайшлі
Праз глыбоцкі абшар...
«...І шукалі яго,
І знайшлі не ўсяго», —
Кажа ясна нам лёс,
Беларускі да слёз...
«Пунькам» верны мастак!
Дык пра гэта і Знак...

Вельмі зычны быў голас мой у сне, аж разбудзіў.

Аскоміна?

У Любы таксама адчувалася нейкая аскоміна ў настрої. Але ў яе — пасля нашага наведвання Язэпавай магілы.

— Нешта не так, унутры ныe, — казала яна. І пазней прынесла мне райгазету — «Веснік Глыбоччыны». Але пакуль «Веснік...», я прачытала « незалежную — «Вольнае Глыбокае». Дык там Валодзя Скрабатун што нарабіў? Знак Памяці, у сэрцы выпешчаны, што з Валерыем па інстанцыях прасоўвалі, прысвоіў толькі ўладзе: «Дзякуй уладам, што зрабілі Знак!»

— Ага, зрабілі, скляпалі малатком, — кіплю, — і не здагадаліся б пра Пунькі, бо ў іх там маса бібліятэчных мерапрыемстваў, буклетаў, выставаў, афармлення дакументаў і г. д. Што ім у лесе рабіць? А ты, Валодзя, чым ты слухаў? Такі вядомы Чэсь стаў Юзікам! І чаму ты робіш заўвагу, што я чытала «свой» верш? Няўжо мне трэба было дэкламаваць чужы? Накшталт: «Я вас помню...».

Тут вочы нервова «збочылі» ў «Веснік Глыбоччыны»! А там... Падрабязна! Калярова, урачыста-ўзнёсла, іскрыста, як феерверк, на ўсю старонку, таксама: «Я вас помню, а вы?..»

Містыка! Дык скажы, чытач, што сны не спраўджваюцца!

Марыя Баравік

«Замежжа нам дапаможа!»

Еду ў агульнаграмадскім транспарце. Увагу «палоніць» купка смуглявых іншаземцаў: не тое, каб выглядам (да гостарбайтэраў наша вока ўжо звыклася) ці паводзінамі — людзі трымаюцца даволі прыстойна.

Вуха ловіць настойлівыя і незразумелыя, але чымсьці знаёмыя гукаспалучэнні: «Каляляська, каляляська, дабыдзень, тапапацена...» І тут нарэшце да мяне «даходзіць», што чую я родную мову, толькі з моцным акцэнтам. Аж вочы пабольшалі! Разумею: новых работнікаў бывалы праваднік вучыць, як трэба сябе паводзіць у чужой краіне, а тыя старанна слухаюць і паўтараюць за ім новыя словы.

— Куды ні зойдзеце, — кажа завадатар-кіраўнік, — кафэ, магазін, цырульня, паўсюль абавязкова кажыце перш за ўсё: «Вітаю, дабрыдзень, калі ласка, выбачайце, да пабачэння...»

Такая міласць ахапіла мяне да гэтага чалавека — дзе ж гэта ён чуў, каб у Мінску ў кафэ, магазінах ці цырульнях так размаўлялі гаспадары і наведвальнікі?..

Яшчэ выпадак: летам на Нямізе сучасны, модна апрануты, з тэлекамерай у руках афраамерыканец браў кароткія інтэрв'ю ў мінакоў на чысцюткай беларускай мове. Магчыма, ён тут нарадзіўся, але... з якім спрытам, гонарам, годнасцю ён карыстаўся нашай мовай!

...У шэраговай школцы Маскоўскага раёна сталіцы ўзяліся адкрыць першы беларускамоўны клас. Якраз у гэту школу наважвалася ісці першакласніцай мая ўнучка. Настаўнікі папярэджвалі бацькоў: толькі калі набярэцца спіс з пятнаццаці прозвішчаў — клас пачне працаваць на беларускай мове. Чакаем верасня. Ідзем з букетамі і спадзяваннямі. Набралася аж дваццаць пяць вучняў! Радасці няма мяжы! Узіраюся ў спіс, многія ж дзеткі мне знаёмыя яшчэ ад садка, чытаю: Шай і Флорэнс — бразільянкі, Эмір Бюккер — яго бацька з Турцыі, маленькі мулат Іртыза Мухамед, Арнольд Хартман... Мае вы беларусікі! Нізкі вам паклон і шчырая ўдзячнасць! Бразільянка-мама размаўляе з рускамоўным беларусам-татам (інтэрнэт-знаёмства) на англельскай мове. Ды — яшчэ беларускі клас!

— Навошта вы аддалі дзяцей у беларускамоўны клас?

На мяне глядзяць з непадробным здзіўленнем.

— А як інакай? Гэта ж краіна будзе для нашых дзяцей радзімай. Як можна не ведаць роднай мовы?!

Людміла Андзілеўка

Радаўніца



Барыс ПЯТРОВІЧ

Зуб забалеў

звычайныя людзі вельмі рэдка заўважаюць, што яны шчаслівыя

большасць шчаслівых людзей, якіх я бачыў, вельмі часта былі з нейкімі відочнымі фізічнымі недахопамі

іх твары свяціліся шчасцем — яны ведалі кошт жыццю

як ні дзіўна, сярод самагубцаў найменш якраз людзей з фізічнымі недахопамі — яны мацней чапляюцца за жыццё і ніколі не аддадуць яго за, да прыкладу, няшчаснае каханне

бо любое каханне для іх шчасце — паздзекуецеся вы, чалавек здаровы, які ведае, што шчасця ўвогуле няма на гэтым свеце, а ёсць спакой і воля

дык вось — у іх няма спакою і волі, але шчасце ў іх, у адрозненне ад вас, ёсць

шчасце быць...

яны цэняць кожны дзень пражыты тут нават у страшных пакутах, і ніколі не спяшаюцца туды, куды вы, ні на хвіліну не задумаўшыся, зробіце крок са шматпавярховіка, у жаданні адпомсціць ёй (яму) за тое, што не заўважае вас, кахае іншага

спытай звычайнага чалавека: ці шчаслівы ён? не — адкажа чалавек ні на хвілю не засумняваўшыся ў гэтым

той чалавек, які не сумняваецца, што ён няшчасны, і ёсць сапраўды шчаслівы, бо нішто не прымусіла яго задумацца: а што такое шчасце?

і калі б ён задумаўся, то прыйшоў бы да высновы, што шчасце — гэта зусім не вялікія грошы, не сусветная слава, не бязмежная любоў і нястрымнае каханне, не сытае жыццё і не ўлада над іншымі...

праўда, прыйсці да гэтага разумення можна толькі праз боль і пакуты

іншага шляху не дадзена

але — у мяне зноў забалеў зуб.

і падумалася: калі ён ужо скончыцца, гэты боль, калі яны ўжо скончацца, гэтыя зубы? колькі можна іх свідраваць, залечваць, вырываць, замяняць на ўстаўныя...

нехта сказаў бы: не было б большага гора...

а іншы — няўжо ёсць на свеце людзі, якія ніколі не пакутвалі ад зубнога болю і ад болю ўвогуле —

зубнога, галаўнога, сардэчнага, душэўнага... болю ад парэзанага пальца, прабітай на цвік нагі, абадранай аб калючкі акацыі ці трымай-дрэва рукі, разбітай пры аварыі машыны галавы

ад хакейнай шайбы па шчэлепах, ад укусу любімага сабачкі...

ад здрады

ад крыўды, ад несправядлівасьці...

можна бясконца працягваць называць тое, што можа прычыніць нам боль — выпадкова і наўмысна

але самы просты боль, дадзены нам пры нараджэнні і незалежны ад таго, хто ты — кароль ці свінапас — боль зубны

азіраюся назад і, колькі сябе памятаю — памятаю зубны боль, ледзь не першыя ў жыцці ўспаміны звязаныя менавіта з ім

зубы і раслі ў мяне, вылазілі з дзёснаў са страшным болем, а ўжо трохгадовага, а, можа, і меншага, маці павяла мяне да зубнога ўрача

памятаю, як баяўся я ісці ў ягоны кабінет, памятаю, як непрыемна і, галоўнае, як балюча было — ніякіх абязбольваючых, якое там... тата і мама трымалі мяне за рукі і ногі, а я круціўся ў крэсле, як вуж, як уюн на патэльні, але вырвацца не змог і цётка Дора, адцягнуўшы маю шчаку сваім тоўстым жоўтым пальцам, які я стараўся ўкусіць, рабіла ў маім роце яшчэ большы боль нейкай страшна бліскучай металічнай штукай...

Дора Львоўна... даўно няма вас на белым свеце... быў нядаўна на могілках і бачыў помнік на вашай магіле, там, на здымку на ўвесь намагільны камень, вы як жывая — такая, якой вас я і памятаю

колькі людзей вы ўратавалі ад пякельных пакутаў і колькі праклёнаў і матаў пачулі пры гэтым... пэўна, ніводнага са шматлікіх урачоў не праклінаюць так часта, як стаматолага, і нікому так шчыра не бываюць удзячнымі...

класе ў сёмым я цвёрда вырашыў падлячыць усе свае карыесныя зубы і пачаў адпрошвацца ў настаўнікаў з апошніх урокаў, каб пайсьці да вас, Дора Львоўна, даруйце за слова — на экзекуцыю; вы былі цудоўным урачом, але то ж быў час савецкай медыцыны — суровай і беднай: лекаў не хапала, тэхнікі патрэбнай таксама... страшна згадваць той бур, якім вы свідравалі мае зубы: вы цiскалі на нейкі педаль левай нагой, і бур уядаўся ў мае зубы, і тыя свінцовыя пломбы, якія вы ставілі, і невыносны пах эфіру — я яго дагэтуль ненавіджу і невыношу, і ад адной згадкі пра яго пачынае кружыцца галава... але я мужна хадзіў кожны дзень да вас на лячэнне і калі адпрасіўся з уроку ў чацвёрты ці пяты раз запар, а так супадала неяк, што ў адной і той жа настаўніцы, яна, відаць, не паверыла, што я магу дабраахвотна хадзіць да стаматолага і прыйшла праверыць, ці праўда тое; калі настаўніца зайшла ў пачакальню і ўбачыла мяне там, вочы яе акруглілілся ў здзіўленні і ёй нічога не заставалася, як сесці побач; падыйшла мая чарга заходзіць у кабінет, і я па-джэнтльменску прапанаваў настаўніцы пайсьці



перада мной, не-не, замахала яна рукамі, ідзі сам...

зразумела, калі я выйшаў ад Доры Львоўны, настаўніцы, як казалі ў нас — і след прастыў

на першым курсе журфаку я напісаў апавяданне (цяпер сказалі б — фэнтэзі) «Прыгоды ў горадзе шкілетаў», апавяданне тое згубілася недзе ў часе, але змест яго я памятаю:

...калі я быў у ванне, раптам з крану замест вады пачалі выпадаць маленькія рыбкі, якія накінуліся на мяне і абгрызлі ўсяго за некалькі імгненняў: абсалютна без болю — толькі вада вакол пачырванела — і ад мяне застаўся голы, белы шкілет... мне трэба было ісці на заняткі, я апрануўся (сяк-так начапіў на сябе адзенне), і выйшаў у горад поўны такіх самых людзей-шкілетаў... аднак, не буду пераказваць сюжэт, бо згадаў я той аповед дзеля адной дэталі, якая дужа спадабалася майму аднакурсніку Воўку Сотнікаву; дэталь такая: з-за таго, што ў мяне не было вуснаў, сталі відаць мае кепскія зубы са свінцовымі пломбамі і я, саромеючыся, закутваюся ў шалік, каб іх ніхто не бачыў... Воўка дзівіўся: як я мог такое прыдумаць пра зубы... дзівак, вось гэтага якраз, у адрозненне ад астатняга, я і не прыдумляў, я толькі ўявіў сябе ў падобнай сітуацыі... дарэчы, потым, калі трэба было прайсьці медкамісію перад будатрадам, я, баючыся, што мяне не пусцяць у яго з-за кепскіх зубоў, ці, крый Божа, прымусяць лячыць іх да ад'езду, папрасіў Воўку прайсці стаматолага... калі ж праз паўгоду боль прымусіў мяне самога звярнуцца ў паліклініку, доктар доўга не магла разабрацца: што такое, на картачцы пазначаныя адныя запламбаваныя зубы (Воўкавы), а на яве перад ёю зусім іншыя... «Сяргеевіч п'яны запаўняў картку», — сказала яна медсястры і папрасіла мяне шырэй раскрыць рот...

Любое жыццё — радасць. А смерць — не страшная. Яна — ніякая. І яе няма, пакуль ёсць мы, а калі яна прыйдзе — тады нас ужо не будзе... А будзе — вечны прытулак тут сярод сваіх. Ці можна гэтага баяцца?

а ўвогуле кепскія зубы — гэта бяда ўсіх палешукоў, калі не ўсіх беларусаў; кажуць у нас не хапае ў вадзе фтору ці яшчэ чагосьці, таму і зубы такія нетрывалыя

з дзяцінства памятаю, як кожнае лета па нашай вёсцы хадзіў гарбаценькі фельчар Раманюк з участковай бальніцы, спыняўся каля кожнага калодзежа і нешта сыпаў у яго... старыя жагналіся і не хацелі піць калодзежную ваду некалькі дзён, маладзейшыя ведалі: падсыпае фтор, якога не хапае ў нашай палескай вадзе, падсыпае, каб зубы ў вяскоўцаў не чарвівелі і не высыпаліся без часу...

з тых летніх дзён мінула шмат гадоў, скроз якія меткамі стаяць дні і месяцы, калі я пакутваў ад зубнога болю — дома, у камандзіроўцы, у вандроўцы, падчас выступу — у самых розных месцах і сітуацыях... найчасцей мне не верылі, што гэта праўда — што я не прыдурваюся, не адлыньваю ад чагосьці, а сапраўды нешта не магу рабіць, бо проста кашмарны боль... трэба сказаць, што гэты самы боль ніколі ў мяне не ўскладняўся нейкімі флюсамі — знешне было ўсё як звычайна, хіба твар можа трохі чырванейшы — вось павер, што чалавек сапраўды пакутуе, а не выпендрываецца... дзякуй тым, хто верыў і суперажываў, дарую тым, хто не верыў і прымушаў працаваць, нават здзекаваўся... колькі розных абязбольваючых я перапіў, часам, даводзячы сябе да паўвар'яцкага стану... але прайшлі постсавецкія часы, з'явіліся «капіталістычныя» стаматалагічныя матэрыялы і прыстасаванні, і мне за месяц, праўда, за немалыя грошы, абсалютна без болю залячылі ўсе зубы, падзівіўшыся некалькім свінцовым пломбам ад Доры Львоўны, якія ніяк не павінны былі б столькі гадоў стаяць паводле ўсіх інструкцыяў...

я адчуў сябе чалавекам... я адчуў сябе шчаслівым

але няма нічога вечнага... тым болей шчасця...

бо

у мяне зноў баліць зуб,

пішу гэтыя радкі і ў вачах цямнее ад болю, баліць уся сківіца, баліць вуха, баліць уся галава, баліць чэрап — чаму там так балець, здавалася б, костка ж... і колькі таго зуба...

ажыў незабіты — недабіты — нерв, языком да зуба не дакрануцца, халоднае патрапіць — хоць ты крычы ў неба, гарачае — не супакойвае: клін клінам — не праходзіць... толькі лячэнне, толькі стаматалогія

заўтра я туды пайду

пайду, каб потым яшчэ раз уразумець, што ёсць, аказваецца, і на гэтай зямлі моманты, калі пачуваеш сябе шчаслівым

Радаўніца

Чарка пайшла кругам — ад вуснаў да вуснаў. Кожны браў у рот маленькі каўточак пякуча-цёплай вадкасці і перадаваў чарку суседу.

Людзі і сапраўды сядзелі колам укруг разасланых на траве рушнікоў і абрусаў, застаўленых талеркамі з ежай. Пляшка на ўсіх была адна, і чарка адна. Год тысяча дзевяцьсот пяцьдзясят дзявяты.

Дзеці весела бегалі ад купкі людзей да купкі, гулялі ў «біткі», а дарослыя сядзелі вакол абрусаў і рушнікоў сур'ёзныя, але разгаворлівыя.

Дрэвы шапаталі — перашэптваліся, птушкі шчабяталі-перасвістваліся, людзі гамانілі, дзеці сакаталі... Маўклівымі былі толькі крыжы наўкол. Але не страшнымі сёння.

Радаўніца — у нас кажуць, што ад слова «радавацць» (ці радавацца). Радавацца жыццю, пакуль жывы. Вучыцца разумець, што любое жыццё — радасць. А смерць — не страшная. Яна — ніякая. І яе няма, пакуль ёсць мы, а калі яна прыйдзе — тады нас ужо не будзе... А будзе — вечны прытулак тут сярод сваіх. Ці можна гэтага баяцца?

...Чарка адна — вуснаў трынаццаць. Але па трэцім крузе — усе будуць п'яныя. Усім хопіць адное пляшкі. Хмель асвеціць вочы, улагодзіць вусны. І добра будзе ўсім у гэтай гамане, і п'янка. І турботы ўсе забыліся, і клопаты засталіся там, у гасцях, бо толькі тут яны дома, сярод сваіх. Ніхто пра гэта не кажа, мажліва, ніхто пра гэта і не думае, яно проста ёсць, як дрэвы, як крыжы, як птушкі, як вецер, як чарка...

Я яшчэ не нарадзіўся, але ўжо быў тут.

Кропка вяртання



Ярына ДАШЫНА



Фота www.LuxFon.com

***

Птушка, спавітая небам, —
у неба ірвецца.
Я ахвярую табой, калі давядзецца.
Час набаўляе зморшчынак і тугі.
Сыйдуцца на вадзе кругі
кропкай вяртання
з небыцця.
Я —
жыцця адчуванне —
магутнасць і безвыходнасць:
глебы карэнне
і хворай зямлі бязроднасць.
Ты ў ахвяру прынёс мяне
гэтай клетцы...
Птушка, спавітая небам, —
у неба ірвецца.

Радаўніца

еду да мамы...
еду да таты...
СВЯТА

***

Мама пераносіцца далей:
за тужлівы подых сцюж-завей,
за дажджы і шэрыя туманы...
За нявіннасць праўды і маны.
І здаецца, мамы не было,
не спявала сэрца, не цвіло
бэзава-язмінным... Сухавей.
Цьмяна ўсё.
І мама ўсё далей....

твая вайна

нясі гэты крыж
між
падобных табе
дзе
кожны ўбок
крок
карае твой
Бог

***

вось мы з табою і квітыя
з побытам вершы зжытыя
тысячы ват
слова-злучэннямі звітыя
ў цішыню пралітыя
неўпапад
вось я табе ў дадатак
бонусам ці на ваты
ці проста так

У вітрыне

Нелюдзімая ноч.
Ліхтары адзінокіх тапаляў.
І пакуль горад спіць,
прытупляючы рытм і бег,
свет падвешаны на цвікі
пад нябесную столяй
растрасае ў паветры
бязважкі пялёсткавы снег.
І пакуль горад спіць,
мішурою прысыпаны белай,
сніць заганы людскія
пад коўдрай пуховай сваёй,
ты, чужая яму, спавіваешся
вершам збалелым.
Ты чужая яму...
І заўсёды была чужой
дэкарацыям-шыбам
у люмінісцэнтнай краіне,
пад нябесную столлю
распятай на бляск цвікоў...
Так падобны тапалі на дрэвы
у гэтай вітрыне,
і сцэнар на жыццё,
і ворагі на сяброў...

Біябібліяграфічнае

Усё адбалела і стала няважным.
Нас раздзяляюць кропка й працяжнік
між элементамі апісання.
Час на спісанне.
Пад загатоўкі і пад загалоўкі...
Нeяк няўтульна і неяк няёмка
у гэтай позе —
вершам у прозе...

***

адваяваныя рана вымерлі вершы
да дна
бачыш на гэтым пляцы
толькі адзін паяцы
адна
я натоўп забаўляю зграю звяроў
людзей
сцэны жыцця са сцэны
голас цішэй

Здрада

Неба — нібы па-над небакраем
рушніком упрыгожылі абраз...

Засталіся там, дзе пакідаюць,
здраджваюць у самы цяжкі час.
З словамі на вуснах невымоўна —
ў той прасторы, у хвіліне той,
дзе адбыўся раптам бессэнсоўны
у сістэме чалавечай збой.
Дзе змаўчалі з кратамі на сэрцы
і атруту выпілі нагбом...

па-за небакраем адгукнецца
шапатком.

***

Пахне твой швэдар табой і тваім раем.
Я дастаю табе да пляча, я зазіраю
ў вочы твае, шэра-зялёны бурштын.
Я не была ніколі такой маленькай:
сонца ў валасах, на запясці фенькі,
безабаронный зусім і нічыйнай зусім.

Бог — гэта і ёсць сэнс, я адчуваю
пера-ўвасабленне,-тварэнне адчаю,
-мысленне часу ў рэжыме он-лайн.
Я не была ніколі такой старою:
сонца ў валасах фарбаванае хною,
восень у кубку — брыкецік цукру і лайм.

Кісла-салодкія ноткі прысмакам новым.
Проста і сумна, і весела адначасова.
І разумееш сутнасць сумневу, маўляў —
гэта ўсяго невымернасці небакраю.
Людзі стамляюцца жыць і паміраюць.
Людзі, якіх ніколі ніхто не кахаў...

***

Калі аднойчы на зямлі засцюжыць
і стане змрок заслонай уваччу,
перакладзі мяне на мову птушак,
я разам з імі ў выраи палячу.
Не адагрэцца, не адвершавацца,
не адарвацца ад прамерзлых слоў...
Я буду толькі аднаго баяцца —
нібыта забываю зноў і зноў
шляхі назад, вяртання да Айчыны,
і крыл узмах над пругкай сінявой...
І галасы каханых і любімых,
і голас свой.

***

Ніхто да цябе не падобны
у гэтым сусвеце падробным,
на гэтай зямлі.
Ты сам і канец, і пачатак
сябе,
ты і воля і краты.
І камяні,
калі прыйдзе час паняверцы,
збіраць аднаму давядзецца
ў полі сваім...
І будзе заўжды адзіным
і дрэва, і тая галіна,
з якой адарваўся,
сын.

Парцэлы



Алесь МАКРАЦОЎ

***

Го́рада
гаснучыя агні.
Вуголле начнога
вогнішча.

***

Шчасця...
падснежнікі.
Пасля скрухі
і суму...

***

Штрыхавы
код...
з роднага
лесу...

***

Залатое
ядро...
веснавой
поўні...

***

Сінусоіда змяі...
рэчку пераплывае...

***

Неба...
душу прыцягвае.
Цела —
вабіць зямля.

***

Горад...
разбаўлены
градамі.
Дачы...

***


Ліпкае
сонца...
потнага
ліпеня...

***

Соль...
незабытых
вякоў.
Мова...

***

Не стала...
у лесе дарог,
не сапсаваных
коламі...



***

Дарожная
сетка...
Сістэма
людазвароту...

***

Прабітай
шыны...
шыпенне
гадзючае...

***

Двухмоўная
творчасць...
Як зберажэнні
ў рублях і эўра?


***

Асмялеў...
малады лес.
Увайшоў
у вёску...

***

Юбілейны
падарунак
дачкі...
Унучак...

Пад чужынскім прыгнётам



Уладзімір АРЛОЎ

Пры канцы XVIII стагоддзя тры краіны — Расея, Аўстрыя і Прусія — таемна змовіліся і падзялілі паміж сабой Рэч Паспалітую, куды ўваходзілі Польшча і Вялікае Княства Літоўскае. Дзяржава нашых продкаў — ліцьвінаў-беларусаў — страціла незалежнасць і трапіла ў адсталую Расею, якую называлі жандарам Еўропы і турмой народаў. Беларусы добра памяталі, што з усходу заўсёды прыходзілі заваёўнікі, якія рабавалі нашы гарады і вёскі, прыносілі голад і хваробы, гналі да сябе тысячы палонных. Аднак — каб падмануць новыя пакаленні беларусаў — у царскай, а потым у савецкай імперыі захоп Літвы-Беларусі называўся «доўгачаканым ўз'яднаннем», хоць беларускія землі ў складзе расейскай дзяржавы ніколі не былі, а прадзеды ніколі туды не імкнуліся, бо ведалі, што іх там чакае.

Беларусы галасавалі нагамі

У Расеі сялян прыгняталі больш жорстка. Замест ранейшых разлікаў з гаспадарамі грашыма вяскоўцаў пагналі на паншчыну. Цяпер вельмі часта на панскім полі трэба было гнуць спіну ўсе сем дзён тыдня. У сялян маглі адабраць іхні надзел зямлі разам з гаспадаркай і прымусіць працаваць за мізэрны харч. Такія паднявольныя людзі нічым не адрозніваліся ад рабоў на тагачасных амерыканскіх плантацыях. У пецярбургскіх і маскоўскіх газетах друкаваліся абвесткі памешчыкаў аб продажы пародзістых сабак і сялян, прычым сабакі часта ставіліся гаспадарамі на першае месца.

Расейскія землеўладальнікі, якім у Беларусі было пры канцы XVIII стагоддзя «пожаловано» паўмільёна сялянаў, тысячамі адрывалі іх ад родных мясцін і адпраўлялі ўглыб Расеі на цяжкія будаўнічыя работы. Царскія законы дазвалялі прадаваць прыгонных сялян без зямлі, разлучаць мужа з жонкай, бацькоў з дзецьмі. Гаспадары мелі права як заўгодна караць прыгонных і нярэдка нявечылі або забівалі іх, але заставаліся беспакаранымі.

За «шчасце» такога «ўз'яднання» нашыя продкі галасавалі нагамі. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў 1772 годзе, з захопленага абшару Полацкага, Віцебскага і Мсціслаўскага ваяводстваў у Вялікае Княства Літоўскае ўцяклі больш за 30 тысяч беларусаў. Калі з дапамогаю расейскіх штыхоў былі паняволеныя ўсе нашыя землі, вяскоўцы пачалі пераходзіць у Беласточчыну, якая трапіла пад уладу Прусіі.

Гарады без вольнасцяў і гербаў


Як вы ведаеце, гарады ў Вялікім Княстве Літоўскім мелі шырокія правы. Гараджане-месцічы выбіралі раду, якая кіравала гарадскім жыццём, абараняла сваіх купцоў і рамеснікаў, збірала падаткі. Селянін, які ўцякаў ад лютага пана ў горад, рабіўся вольным чалавекам.

Права горада на самакіраванне называлася магдэбургскім, бо яно ўпершыню ўзнікла ў нямецкім Магдэбурзе, а затым хутка пашырылася па еўрапейскіх краінах. У Расеі, якая не належала да Еўропы, магдэбургскага права ніколі не было. Там гараджане, параўнаўча з нашымі месцічамі, былі бяспраўнымі царскімі падданымі.

Захапіўшы беларускія землі, царскія ўлады адабралі ў нашых гарадоў усе магдэбурскія правы. Пад забарону трапілі і даўнейшыя гербы, якія былі на гарадскіх пячатках і аздаблялі ратушы — будынкі, дзе працавала рада. Самі ратушы, што, як і гербы, нагадвалі месцічам пра былыя вольнасці і незалежную дзяржаву, таксама мулялі вока новым гаспадарам. У колішніх ратушах расейцы парабілі суды, турмы, паліцэйскія ўправы. Калі пад час пажару згарэў будынак ратушы ў Навагрудку, імперскія чыноўнікі так і не далі дазволу на яе рамонт. Гэты дазвол павінен быў прыйсці з Пецярбурга, дзе вырашаліся нават пытанні перабудовы якога-небудзь свірна, не кажучы ўжо пра ратушы. Такія парадкі панавалі ў Расейскай імперыі.

Часам ратушы не хацелі прыстасоўваць пад іншыя патрэбы, а проста руйнавалі. Такі лёс напаткаў ратушу ў Менску. Расейскія ўлады спрабавалі знішчыць яе рукамі саміх менчукоў, але пралічыліся. Жыхары адмовіліся зносіць дарагі ім прыгожы будынак са старадаўнім гадзіннікам, які адбіваў час ажно з 1600-га года. Ратушу разбуралі салдаты царскага гарнізона. Гадзіннік купіў нейкі расейскі памешчык. Ён хацеў аздобіць гадзіннікам свой маёнтак і загадаў пабудаваць дзеля гэтага адмысловую вежу. Захавалася паданне, што, калі гадзіннік узнялі на вежу, яна абрынулася і пахавала гарадскую рэліквію. Менчукі казалі, што гадзіннік не захацеў адлічваць час чужынцам.

Менскую ратушу з гадзіннікам аднавілі толькі ў XXI стагоддзі.



Вокладка першай кнігі «Айчына. Маляўнічая гісторыя»

Зруйнаванае Берасце

У ажыццяўленні сваіх планаў каланізатары цалкам пагарджалі інтарэсамі нашых людзей. Самы красамоўны прыклад гэтага — лёс старажытнага Берасця, якое пры канцы XVIII стагоддзя лічылася адным з найпрыгажэйшых гарадоў Усходняй Еўропы.

Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, што адбыўся ў 1795 годзе, расейцы вырашылі пабудаваць у Берасці фартэцу для ўмацавання заходніх межаў імперыі. Царскія вайсковыя інжынеры новыя ўмацаванні вырашылі размясціць не побач з горадам, а якраз на яго месцы. Улады мала цікавіла тое, што тысячы месцічаў будуць выгнаныя з родных сценаў. Старадаўнія храмы, манастыры, палацы, жылыя будынкі былі зруйнаваныя. Каланізатары знішчылі цэлы горад, а жыхароў перасялілі за некалькі кіламетраў.

Царскую фартэцу збудавалі ў 1830–1840 гадах. Таму цяпер у Берасці няма будынкаў, старэйшых за дзвесце гадоў. Успомніце пра гэта, калі будзеце на экскурсіі ў сучаснай Брэсцкай крэпасці.

Раскраданне ліцьвінскіх скарбаў

У Расею вывозілі багатыя бібліятэкі і мастацкія калекцыі нашых арыстакратаў. На ўсход везлі каштоўныя архівы і летапісы, што захоўваліся ў манастырах, замках ды палацах арыстакратычных родаў.

Як сведчаць гістарычныя дакументы, Публічная бібліятэка ў Пецярбурзе выбірала сабе «все редкие и роскошные издания, коих она не имеет и, следовательно, могущие служить ее украшению». У наш час у адной толькі Дзяржаўнай бібліятэцы Расеі ў Маскве знаходзяцца 82 выданні Францішка Скарыны. Між тым у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі іх усяго дзесяць, а ў Полацкім Музеі беларускага кнігадрукавання няма ніводнага.

Маскоўскія і пецярбургскія музеі ганарацца цяпер мастацкімі творамі з Нясвіжскага замка Радзівілаў. У Смаленскім гістарычна-археалагічным музеі можна ўбачыць калекцыі князёў Сапегаў. На пальцах адной рукі можна пералічыць сёння славутыя слуцкія паясы, якім пашчасціла застацца ў Беларусі. А вось у расейскіх музейных эскапазіцыях і сховішчах лік гэтых шэдэўраў беларускіх майстроў ідзе на сотні.

Рабуючы нашыя каштоўнасці, каланізатары рабавалі душу народа, падрывалі яго ныя жыццёвыя сілы.

«Нас пагоняць у Маскву, на вайну...»

У царскай імперыі на Беларусь лёг цяжар падаткаў, якія напачатку былі ў пяць разоў большыя, чым у расейскіх губернях. Апрача падаткаў, на вясковае і гарадское насельніцтва наклалі іншыя павіннасці, самай цяжкай з іх стала рэкруцкая. Па гэтай павіннасці юнакоў і мужчын ад 19 да 35 гадоў забіралі ў царскае войска. Служыць спачатку трэба было ўсё жыццё, потым гэты тэрмін паводле «ласкі» імператрыцы Кацярыны II скарацілі да 25 гадоў. У мірны час у салдаты бралі з 500 душ аднаго хлопца, а ў вайну — чацвярых, пецярых і нават васьмярых. Родныя забраных ведалі, што амаль ніхто з іх ужо не вернецца дадому. Тужлівымі і поўнымі болю былі рэкруцкія песні:


Будуць мяне, малайца,
у салдацікі браць.
Будуць мне, малайцу,
белы ручкі вязаць.
Будуць мне, малайцу,
скоры ножкі каваць.
Будуць мяне, малайца,
у няволю адпраўляць...

Да канца XVIII стагоддзя беларускія губерні далі царскай арміі больш за 100 тысяч салдат. Беларусы-ліцвіны заўсёды былі добрымі ваярамі, але цяпер мусілі ўдзельнічаць у захопніцкіх паходах царскіх генералаў і гінуць за чужыя інтарэсы. У адной з рэкруцкіх песняў гучалі такія горкія радкі:

Нас пагоняць у Маскву, на вайну,
У Расею, на чужую старану...

Не Якуб, а «Яков», не Паўліна, а «Полина»

У Расеі беларусаў не лічылі самастойным народам і не прызнавалі нашае мовы. Вы памятаеце, што ў продкаў адбіралі іхнія спрадвечныя імёны. Якубаў у новых дакументах ператваралі ў «Яковов», Астахаў у «Евстафиев», Паўлінак зрабілі «Полинами», Анэляў — «Аннами». Царскія пісары, хто як хацеў, парабляли на свой расейскі капыл нашыя старадаўнія імё-



ны Усяслаў, Брачыслаў, Альгерд, Рагнеда, Звеніслава...

Вельмі не падабаліся пісарчукам і «неправаслаўныя» імёны. Габрыэль ці, напрыклад, Мальвіна, маглі стаць «Гаврилой» і «Марфой», Ян — «Иваном». Згоды на гэта ніхто не пытаўся. Да беларускіх прозвішчаў дадаваліся расейскія канчаткі, а сялян пачасту проста запісвалі на прозвішча памешчыка.

Такім чынам беларусаў таксама пазбаўлялі памяці, каб перарабіць на расейцаў.

Людзі другога гатунку

У Вялікім Княстве закон даваў жанчынам — шляхцянкам і мяшчанкам — шырокія правы ў валоданні маёмасцю. У Расеі жанчыны такіх прывілеяў тады не мелі. Вольныя ліцвіны страцілі таксама шмат іншых ранейшых правоў.

Большасць нашых продкаў у той час былі вуніятамі. Царская ўлада ненавідзела народную вуніяцкую веру, бо яна захоўвала мову і звычаі народа і перашкаджала рабіць ліцвінаў-беларусаў расейцамі. Вуніятаў пачалі гвалтам пераводзіць у праваслаўе. Аднак новыя гаспадары не даверялі і мясцовым праваслаўным святарам. Беларусаў адпраўлялі служыць у далёкія губерні імперыі, а адтуль да нас прысылалі расейцаў. Гэтыя папы не ведалі ні мовы, ні традыцыяў прыхаджан. Яны зацята змагаліся з калядаваннем, гуканнем вясны, Купаллем, Дзядамі, з усімі спрадвечнымі беларускімі святамі і звычаямі.

У Расеі людзьмі другога гатунку зрабіліся габрэі, якія некалькі стагоддзяў жылі ў Вялікім Княстве Літоўскім і мелі там шмат правоў. Царскія ўлады абклалі габрэяў-юдэяў цяжкімі падаткамі і ўстанавілі для іх «мяжу аселасці», за якой не дазвалялася сяліцца.

Усіх нязгодных з новымі парадкамі бязлітасна каралі. Гэта ў Расейскай імперыі заўсёды ўмелі рабіць. Дзяржаўным злачынствам лічыліся нават «дзёрзкія абразлівыя словы». Нашых продкаў кідалі ў турмы, адпраўлялі на сібірскую катаргу, высылалі ў арыштанцкія роты. Жудасным пакараннем, якога не ведала ніводная еўрапейская краіна, было біццё шпіцрутэнамі — доўгімі гнуткімі дубцамі. Асуджанага з агаленай спінай гналі праз шыхт узброеных шпіцрутэнамі салдат. Часам прысуд патрабаваў зрабіць некалькі тысяч удараў, пасля чаго чалавек звычайна паміраў.

Мары аднавіць дзяржаву

Магнаты і ліцьвінская шляхта, якіх у Вялікім Княстве называлі «палітычным народам», каб захаваць маёнткі, прысягнулі царскаму трону, але былі пазбаўленыя ранейшых прывілеяў і вольнасцяў. Апрача таго імператар Аляксандр I загадаў праверыць шляхецкія дакументы і ўсіх шляхцічаў, якія не пацвердзяць свае правы, прыпісаць да сялян або мяшчан.

Цар і ягоны ўрад баяліся вольналюбівага «палітычнага народа», а шляхта варожа ставілася да новай улады і марыла пра адраджэнне ўласнай дзяржавы і яе вяртанне ў Еўропу.

У 1811 годзе група арыстакратаў-ліцьвінаў прапанавала цару Аляксандру аднавіць Вялікае Княства Літоўскае і вярнуць яму землі, страчаныя ў выніку Люблінскай вуніі 1569 года з Польшчай. Пасля гэтага меркавалася прыняць канстытуцыю, вызваліць беларускіх сялян ад прыгону і правесці дэмакратычныя змены. Галоўным аўтарам пададзенага цару праекта стаў граф Міхал Клеафас Агінскі, якога добра ведалі не толькі на нашых землях, але і ў многіх еўрапейскіх краінах.

Малюнак Паўла Татарнікава

ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ 2019 года:

пра беларускія мерыдыяны, украінскія паралелі, львоўскі экватар

Спаўняецца 990 гадоў ад нараджэння Усяслава Чарадзея (29.07.1029–14.21.04.1101), сына Брачыслава, унука Рагнеды. 975 гадоў таму ён заняў пасад князя Полацкага (1044); быў на пасадзе князя кіеўскага (1068–1069).

Мяне гукалі леты на улонне,
каб летапісы дзвінскія бярог...
Як Усяслаў, дасюль я у палоне
маіх на бацькаўшчыну выбраных дарог.
І Беларусь крывіцкая аберуч
узважвае сыноўскае крыло:
маю любоў, маю адданасць, веру, —
усё, што вывела мяне за родны бераг
і што назад на бераг прывяло.

(З верша Сяргея Панізьніка «Бераг».)

915 гадоў ад нараджэння княжны, заступніцы і нябеснай апякункі нашай зямлі Еўфрасінні Полацкай (5.01.1104–5. 06.1173). Першая жанчына, кананізаваная Рускай праваслаўнай царквой у 1547 г., прылічана да ліку святых у 1893 г. Па яе заказе майстар-ювелір Лазар Богша ў 1161 г. стварыў напрастольны крыж. Мастацкія асаблівасці шэдэўра сведчаць пра сувязі з традыцыямі кіеўскай ювелірнай школы. У 1187 г. мошчы Еўфрасінні з Іерусаліма былі перанесены ў Феадосіеву пячору Кіева-Пячорскай лаўры. Яе нятленныя астанкі перавезены ў Полацк — у Спаса-Еўфрасінеўскі манастыр. 5 чэрвеня — Агульнанародны Дзень Святой Еўфрасінні Полацкай.

Я — адна
Кветка зорная
З неба сіняга.
Я — вясна
Непаўторная.
Еўфрасіння Я!

(З песні «Споведзь»: музыка Віктара Войціка, словы Сяргея Панізьніка.)


450 гадоў таму Іван Фёдараў з Пятром Мсціслаўцам выдалі «Евангелле вучыцельскае» (1568–1569), а таксама кнігі «Псалтыр», «Часасловец» (1569–1570).

445 гадоў таму Іван Фёдараў у 1574 г. выдаў у Львове першую ўкраінскую друкаваную кнігу «Апостал» і наступную — «Азбуку» («Буквар»). У Астрогу выдаў «Храналогію» Андрэя Рымшы: гэта першы беларускі друкаваны каляндар і першы выдадзены твор беларускай паэзіі.

Івана Фёдарава (Федаровіча) з беларускага роду Рагозаў лічаць заснавальнікам кнігадрукавання і ў Расіі, і ва Ўкраіне. Пахаваны «друкар кніг дагэтуль нябачаных» у Ануфрыеўскім манастыры Львова.

Самотны Леў стаіўся каля вежы.
Ён зіркачам-хімерам не раўня.
Туман яго атульвае ў начлежжы,
загрывак абдымае цішыня.

(З верша «Львоў» Натальі Пазьняк у перакладзе Сяргея Панізьніка)



205 гадоў ад нараджэння Тараса Шаўчэнкі, украінскага пісьменніка, мастака, грамадскага дзеяча, заснавальніка новай украінскай літаратуры і нацыянальнай літаратурнай мовы. 190 гадоў таму ён, казачок (дваровы) П.Энгельгарта, прабіраўся Віленскім гасцінцам у Пецярбург. Каля вёскі Мясата Маладзечанскага раёна ўстаноўлены мемарыяльны знак у гонар тых, хто праходзіў у Вільню гэтым гасцінцам: С. Будны, Т. Шаўчэнка, М. Гогаль, Я. Купала, Я. Колас і дзясяткі іншых. У 1839 г. у Пецярбургу Шаўчэнка пазнаёміўся з Я. Баршчэўскім, Р. Падбярэзскім. Супрацоўнічаў з З.Серакоўскім, Э. Жалігоўскім, Я. Станкевічам. Сябраваў з Б. Залескім. У 1843 г. па дарозе на Украіну наведаў Віцебск, Магілёў, Гомель. Творы Т. Шаўчэнкі перакладалі Я. Купала, А. Гурло, Ф. Чарнышэвіч, А. Паўловіч, А. Гарун, Я. Колас, Зм. Бядуля, К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, Р. Барадулін і інш.

Шлях з Мінска да Вільні:
ад ветласці — ў роднасць...
Слуга, ён быў вінен, бо думаў пра годнасць.
Наперадзе страты, салдацкія ранцы...
Ён Віленскім трактам ідзе — у паўстанцы!

(З верша Сяргея Панізьніка «Віленскі гасцінец». Пераклаў гэты верш на ўкраінскую мову Раман Лубкіўскі)

110 гадоў таму, у 1909 г., педагог Іван Крыпякевіч, выдатны вучоны- гісторык, аўтарытэтны знаўца беларускай культуры, выдаў брашуру «Білоруси», дзе разглядаў гісторыю і пісьменства Беларусі, яе сувязі з Украінай, ацэньваў творчасць беларускіх пісьменнікаў. Упершыню на Украіне былі змешчаны ў перакладзе Мікіты Шапавала вершы Янкі Купалы «А хто там ідзе?» і «Памяці Шаўчэнкі». Аўтар распавёў пра Васіля Цяпінскага, Ф. Скарыну, Ф. Багушэвіча. Для больш шырокага пазнання тэмы заклікаў падпісацца на газету «Наша Ніва».

Гучыць там і такое прызнанне І. Крыпякевіча: «Сярод беларусаў знайшлі мы, украінцы, шчырых сяброў і суседзяў. А іначай не магло быць. Амаль усю мінуўшчыну пражылі мы разам з беларусамі, і ніколі не было між двума народамі якой-небудзь нязгоды... У долі і нядолі ішлі мы ўсе разам».

110 гадоў таму ў львоўскім гадавіку «Літературно-науковий вістнік» (ліпень-верасень 1909 г.) надрукавана нізка вершаў «З беларускай паэзіі», падрыхтаваная перакладчыкам Мікітам Шапавалам. Акрамя купалаўскіх, ён пераклаў і два вершы М. Багдановіча: «Над магілай» і «Прыдзе вясна». А сам М. Багдановіч пераклаў вершы Т. Шаўчэнкі, І.Франка, М. Кацюбінскага, В. Стэфаніка, В. Самійленкі і інш.

Пясняр — ён ваяр і гісторык
і чорнарабочы, калі
становяцца светлыя творы
малітваю горкай зямлі.

(З верша Сяргея Панізьніка «Паклон».)

110 гадоў таму (вясной 1909 г.) Максім Багдановіч лячыўся ў Ялце (Аўтка, малочная ферма «Шалаш». Летам 1915 г. лекаваўся ў Старым Крыме. Наведаў Кактэбель, Феадосію. У лютым 1917 г. зноў трапляе ў Ялту (назаўсёды). «Шалаш» знаходзіўся на вуліцы Крымская, 2. Яе пераназвалі ў вул. М. Багдановіча. А на будынку былой малочнай фермы была ўстаноўлена мемарыяльная шыльда. Побач, у Місхоры, у 1957 г. былі усталяваны помнік работы Заіра Азгура з надпісам: «Выдатнаму беларускаму паэту Максіму Багдановічу (1891–1917)», які ў 1959 г. стаў узнёслай аздобай парка пры санаторыі «Беларусь». 30 гадоў таму, у снежні 1989 г., у Ялце была ўстаноўлена мемарыяльная дошка з барэльефам: «На этом месте находился дом, в котором жил (с марта по май 1917 г.) и умер 25 мая 1917 г. выдающийся белорусский поэт Максим Богданович». На мітынгу ў гонар такой падзеі дошку адкрыў паэт Мікола Аўрамчык, выступілі скульптар Генадзь Мурамцаў, дырэктар музея М. Багдановіча ў Мінску Алесь Бяляцкі, паэт Сяргей Панізьнік. На ялцінскіх гарадскіх могілках (сектар №7) у 1924 г. быў пастаўлены помнік Паэту. У 2003 г. яго замяніў новы варыянт помніка, створаны Львом і Сяргеем Гумілёвымі.

З песняй кахання ўзнадзеіцца вера.
Промні пастукалі ў шыбу акна,
Каб над Ай-Петры не смягла Венера —
як пры Максіме — адна.

(З песні «Світальная зорка...»: музыка Міколы Яцкова, словы Сяргея Панізьніка.)

100 гадоў таму пачаў выходзіць тыднёвік «Воля» (1919–1921) — спачатку ў Львове, а потым у Вене пад рэдакцыяй Андрэя Горленкі. У перакладзе на ўкраінскую мову Аляксея Ярэмчанкі там былі надрукаваны вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі, Алеся Гаруна. А. Ярэмчэнка змясціў у Волі» (верасень 1921 г.) «Кароткі нарыс гісторыі беларускай літаратуры». А ў 1922 г. у прыгарадзе Берліна — Шарлотэнбурзе — выдаў на гектографе зборнік сваіх перакладаў пад назвай «Білорусь». Там — 17 вершаў М. Багдановіча, 4 — Я. Купалы, 2 — Я. Коласа, па адным А. Гаруна, Зм. Бядулі, Г. Леўчыка.

І заўтра хтось яшчэ адзін абудзіцца,
забыўлівасці распілуе краты.
Святла — у спраты! Ажывайце, страты,
і ўсё, у што паверылі мы, збудзецца.

(З верша «Страты» Сяргея Панізьніка.)

95 гадоў ад нараджэння Васіля Быкава (19.06.1924–22.06.2003) — пісьменніка і грамадскага дзеяча. У 1959 г. прыняты ў СП СССР; у 1964 г. — Лаўрэат літпрэміі імя Я. Коласа; у 1974 г. атрымаў Дзяржпрэмію СССР; ад 1980 г. — народны пісьменнік Беларусі...

Ваяваў на ІІ-м і ІІІ-м Украінскіх франтах. Удзельнічаў у баях за Крывы Рог, Александрыю, Знаменку. Падчас Кіравоградскай аперацыі (1944 г.) быў цяжка паранены (памылкова запісаны ў спісы загінулых). У в. Вялікая Севярынка Крапіўніцкага р-на на брацкай магіле ўстаноўлены мемарыял, дзе было пазначана, што В. У. Быкаў лічыцца забітым 3.01.1944 г. і тут пахаваны. Сам горад Кіравоград пераназваны ў г. Крапіўніцкі.

Сёння знойдзеным ветразем сцелецца
ваяроў-вясляроў павучанне:
анікуды Айчына не дзенецца,
не сплыве Беларусь у маўчанне!

(З верша «Вялікае княства Беларусь» С. Панізьніка.)


Падрыхтаваў Сяргей Панізьнік.
Тэкст друкуецца ў скароце.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 1 (149) | 25 студзеня 2019 | № 3 (614) Новы час



Фота www.foto.by

Адвечны шлях



Алесь КАМОЦКІ

* * *

Куды вядзе мая дарога адусюль,
Дзе я бываю выпадковым чынам
І не умею ведаць пра прычыны
Нягеглых святаў выпітай душы,
Якая не збіралася грашыць.

Дваццаць трэцяга ліпеня
Можа рознае быць ці не быць.
Дваццаць трэцяе ліпеня
Дзень не горшы за іншыя дні,
Каб мінулае выкінуць,
Нешта выдумаць ці адмяніць.
Можа рознае быць і не быць
Дваццаць трэцяга ліпеня.

Калі дарогу бачыць не хачу,
Спыняюся за першым паваротам
І пачынаю марыць неахвотна
Аб новых кроках выпітай душы,
Якая не збіралася грашыць.

* * *

Шукай, знаходзь і не губляй,
І не лічы пачаткі дзён,
Але пра час
Не забывай.
Не забывай —
Яму належыць першы крок,
Ён дорыць вынікі шляхам.
Прыходзіць час
Каб бачыць нас і не знікаць.

Бывае небу не да нас,
Бывае сонца не відно,
Чарговы раз
Прыходзіць час,
Праходзіць час.
І марыць новыя шляхі
Пра крокі нашыя, але
Не бачыць свет
Наступны след.

Часы,
Не мы іх абіраем для сябе —
Іх воляй узнікаюць нашы дні,
Іх воляй пралятаюць нашы дні.

* * *

Усё цяжэй паразумецца з векам,
Шукаць,
пусціўшы стому ў імпэт,
Тых,
для каго застаўся чалавекам.
...і пра самоту марыць неўпрыкмет.

Трымаць недаацэненую шчырасць
Напагатове кожны божы дзень,
Спасцігшы вынік,
забываць прычыну
І лішні раз уперад не глядзець,
Дзе тое, што з гадамі прыгажэе,
Прызнання дамагацца не ідзе,
Дзе сутнасць, перастаўшы быць ідэяй,
На век,
што знойдзе,
тое й пакладзе.

* * *

У снежаньскую сцюжу пачынаўся раман,
Адно што завіруха нешта
бачыць магла —
Гэта зіма.
З ёй зімаваць —
Не дадаць і не адняць.

Гісторыя кахання не давала заснуць,
У мроях недасяжна панаваў сакавік —
Гэта зіма.
Гэту зіму
Ні прыспешыць, ні спыніць.

Бязгучна падышла і не змагла расказаць,
Чым цябе здзівіла напрадвесні яна —
Гэта зіма.
Гэту зіму
Зімаваць і забываць.

* * *

Гарадь паціху свечы,
Рыфмуе думкі вечар,
Не хочацца пытанняў,
На ўсе адзін адказ.
Мы разганяем хмары,
Мы дасягаем мары,
Але, на жаль, не ўстане
Стрымаць бягучы час.

Імгненні як імгненні,
Памкненні як памкненні,
Мужчыны і жанчыны,
Умоўнасці наўкол.
Алоўкам па паперцы
Малюе межы сэрца,
Карцінка як карцінка...
Звалілася пад стол.

Вечар

Харaство знікаючага неба
Сёння зноў наіўна нішчыў вецер.
Наляцеў аднекуль непрыкметна
І шпурляў, шпурляў у неба смецце.

Ці паўночны быў ён, ці паўднёвы...
Ці даўнейшы быў, ці нейкі новы...

Толькі ноч бязродная суцішыць,
Узваліўшы сны яму на плечы.
І ў зніклым небе стане чыста,
І з сусвета зоркамі засвеціць.

Музыка

Вечар, накрыўшы горад
Ціхім і цёмным небам,
Кліча ў вышыню.
Стомленым рэшткам сонца
Перастае належыць
Дзень, што ўжо мінуў.
За
Сонечным святлом
Кропелькі цяпла
Як нотныя радкі.
І
Промнем па струне
Бліскавічны шлях
Бязважкае рукі.
Плыў
Месяцам сівым,
Каб як апошні раз
У гэты дзень глядзець.
Сон
Натоліць нас пасля
Пярэстай хваляй мар,
Чаканняў і надзей.

Хутка раскажа вечар,
Дзе ў вірах мелодый
Новы матыў кране.
Музыцы там спакойна,
Музыка там начуе,
Там яна сніца мне.

* * *

Ходзіцца па зямлі,
Думаецца пры тым —
Як бы ўсе жылі,
Збіўшы сабе панты?

* * *

Дзе сляды ад снягоў,
што ў мінулым жыцці
Пакідаюць зямлю сакавіцкім
дзяньком?
Ім ужо не ляцець, ім ужо не ісці —
Безназоўным і брудным
плысці раўчуком.

* * *

Прыйдзе час, і застануся я ў снах,
Там, дзе хвіліны на імгненні час
не дзеліць,
Там, дзе палёту
без патрэбы будзе цела,
Там, дзе бясконцасцю
нацешыцца вясна.

* * *

Я, як заўжды, маўчу,
Словы вакол стаяць,
Ты, як заўжды, не тут,
І без цябе ніяк.

Сны

Вечар
Сумам пустых завулкаў,
Сполахам крокаў гулкіх
Рушыў у межы сноў.
Спадзеў
Пераглядаў надзеі,
Мары услед ляцелі,
Час у зіму ішоў.

На асфальце мокры снег
Разам з шэрым небам
Невыразны цень
Крадзе
На шляхах
Па слядах былых
Блуканняў.
Так і ноч настане.
Можна сны глядзець,
Можна сны глядзець.

* * *

1
Хмарам неба не належыць,
Неба хмарам толькі так —
У далёкае бязмежжа
Шлях.

Хмары — шэрая навала,
Набягаюць зніадкуль,
Ім бывае месца мала
Пакуль.

Неба — сіняе бязмежжа,
Хмары — плямы па краях.
Хмарам неба не належыць
Аніяк.

Ім жыццё, а нам імгненне,
Хмары маюць іншы час,
Пралятаюць іх памкненні
Не праз нас.

2
Сонца бачыць зверху неба,
Позірк шле за небакрай,
Дзе дзяецца ён пасля —
Шукай.

Хмары неба бачаць знізу,
Цень кідаючы зямлі,
Хай бы ўсе яны ад нас
Плылі.

Зоры неба зверху бачаць,
Так загадкава мігцяць,
Ім адвеку ёсць задача —
Не згараць.

Зоры, неба, хмары, сонца
Карагодам па жыцці
Ноч змушаюць дзень бясконцы
Адпусціць.

Летні сон дрыготкай хваляй
Лёг на плечы цішыні,
І на свеце меней стала
Мітусні.

Рок-н-рольчык з 70-х

за крокам крок
і за парог
а там працяг
жыццёвы шлях
напрамкаў многа
а сэнс адзін
знайсці дарогу
без каляін

сюды-туды
туды-сюды
пад час хады
лятуць гады
пасярод тлуму
штодня часцей
ды будзем думаць
пра ўсё працей

хай гэты час
убачыць нас
каб нам сусвет
глядзеў услед
Каб нашай веры
было дзе жыць
і каб без меры
і без мяжы.

* * *

Жыццё — імклівы рух
сярод спакусаў,
Тут цяжка быць падалей ад граху,
Дык дай жа, Божа, сілы беларусу
Трымацца годна на усім шляху.



Вусны партрэт з вуалеткай



Марыя ВАЙЦЯШОНАК

Волечка

Мяне везлі сябры да хірурга. Волечка, даведаўшыся, што мы можам убачыцца ў горадзе, сустракала нас. Гэта быў завулак, троху скошаны. Волечка ішла, раскінуўшы рукі, яна ляцела. Струменілася, віравала ейная лёгкая дзяргатая сукенка, я аж спужалася напроці ў сваім спрацаваным вясковым адзенні. Мы абняліся, гаварылі гучна, смяяліся пасярод вулачкі. Я рада, калі чалавек, сустрэўшы цябе, не пытае: «Ну як ты сябе адчуваеш?», таму што ён пра цябе ведае амаль усё! Яна прыязджала ў Сілічы. Я не памятаю, якая гэта была пара года, але яна выйшла з машыны ў квяцістай сукенцы. І ўсё зацвіло наогул. У кветках і стужках была машына, быццам вясельны картэж і сам Валодзя, які яе прывёз, быў урачысты, як жаніх. Уменне яе насіць сукенкі незвычайнае. Мне здаецца, яна ніколі не стаіць на месцы. Яна заўсёды перабірае нагамі, як жаробка. Яна валодае нейкім талентам юнацтва, маладосці,таму што знаходзіцца заўсёды ў руху, заўсёды ў нейкім лёгкім настроі. Калі атрымоўваецца іншы раз патэлефанаваць, пагаварыць, то застаецца ўражанне, паклаўшы трубку, што ты пабыў з вельмі блізкім чалавекам. Побач з ёю лёгка рэалізавацца. Ці ты хочаш выказаць сваю думку, альбо нейкі выраз, вобраз. Усё ўзнікае каля яе з неверагоднай лёгкасцю. І яна можа сказаць: «Маша, Маша, гэта ўдача! Запішы абавязкова, а то забудзецца».Ты можаш з ёй падзяліцца радасцю, яна прымае ўсё на свае рукі. З ёй можна пагаварыць, як ні з кім болей. Бывае чалавек, не раўнуючы, як храм, каля яго ты больш шчыры, адкрыты, ты больш дасканалы. Такая Волечка.

Аксана

Гэты дом стаіць праз дарогу, насупраць. Я бачу яго ў верхняе акно, бачу ў другое акно. Я з задавальненнем спыняюся, калі бываю зусім побач, каб з ім павітацца, каб не абысці яго, каб, Божа барані, раптам не заўважыць яго. Дом новы, цікавы, у ім ніхто не жыве, не жывуць людзі, але ён сам па сабе жыве. Калі мы тлумачым, дзе мы знаходзімся, гасцям, што едуць да нас, мы кажам: вы ўбачыце такі дом з зялёным дахам, незвычайны, такі трохі казачны, а тут адразу такая папярэчка. У гэтай папярэчцы мы і жывем. Трэба ехаць адразу да гэтага дому, напрасткі да нас.

Каб мяне запыталіся, каб я сама ў сябе запыталася: «А як я сабе ўяўляю, хто тут мог бы жыць?» Ты, Аксана, вельмі будзеш смяяцца, але мне выдаецца, што ў гэтым доме ты магла б сама жыць. Менавіта ты б магла жыць! І ведаеш чаму? Зараз я буду табе тлумачыць. У чым павінна быць апранута гаспадыня, калі яна заходзіць у гэты дом? Калі мы толькі пасяліліся ў Сілічах, праз акно мы хацелі зазірнуць (дом жа прадаецца), і спрабавалі паглядзець, што робіцца там унутры. Мне падаецца, што там такога бурага колеру мармур на падлозе. Мне падаецца, што ты павінна зайсці гаспадыняй у гэты дом у сукенцы «ў пол», менавіта пад колер мармуру, нешта такога вулканічнага колеру. Як ты там павінна жыць? О! Ты для яго падыходзіш як ніхто іншы. Ты не любіш мыць посуд, але ты можаш накарміць з рукі мужа, дзяцей, птушак, сабак. Далей, я не ведаю, ці іграеш ты на чым-небудзь, але гэты дом патрабуе, каб у яго быў інструмент, хутчэй за ўсё гэта мог бы быць клавесін. Я вельмі люблю клавесін. Дом празрысты, хаця ён не са шкла, але ён празрысты, як можа быць празрыстым рэха, альбо музычная нота. Быццам там, усё што ў доме: паліцы, усё, што на паліцах, расстаўлена, як у музычным радзе, як ноты, а наперадзе скрыпічны ключ. І мне здаецца, што гэтым скрыпічным ключом гэты дом павінен адчыніцца. Зачыняцца ты яго ніколі не будзеш, ты не любіш пільнавацца рэчаў, маёмасці нейкай там. Не-не-не! Ты будзеш выходзіць, дзякуй Богу, што не забудзешся зачыніць за сабой дзверы, і як заўсёды ты любіш, не збіраючыся, не пераапранаючыся, адразу з дому, у чым ты ёсць, сесці і паехаць у Іслач.

Там цябе сустрэне хворы мастак з крывымі капытамі. Ён будзе хадзіць вакол цябе, пастукваючы капытамі, ён будзе разводзіць табе вогнішча. Ты не ў гэтым часе. Я і не ведаю, у якім ты часе знаходзішся, калі туды едзеш, але табе трэба вялікае вогнішча. Ты пасядзіш, ты паглядзіш на гэтае вогнішча, ты пагаворыш, а прыехаўшы,будзеш распавядаць, што ты бачыла агонь. Табе трэба бачыць жывы агонь.

Звычайна, вярнуўшыся, ты залятаеш у краму, як птушка, і тое, што купіла, можаш выцягнуць з кішэні і з'есці. Не патрэбна будзе ні талерка, ні стол, ні нейкія прылады, ні сервіроўка. Божа барані, каб у доме пахла кіслай капустай альбо нейкім баршчом ці нехта варыў варэнне! Я хацела б сказаць, што ўсё гэта я быццам бачу праз сваё акно на другім паверсе.

Я цябе вельмі віншую. І гэты домік я табе падаравала. Таму што ёсць вялікая прычына. Твой дзень народзінаў! Нават калі гэты домік купіць і пасяліцца іншы чалавек, я заўсёды буду яго называць «Аксанін Дом».

Алена

Першы раз Алену мы ўбачылі ў Доме друку, у «Сельскай газеце». Яна заходзіла з мужам у сталоўку, а мы якраз там палуднавалі. Віктар вёў яе за руку.

Лена мае ўсходнюю прыгажосць. Яна мала пра гэта ведае, ніколі не апранаецца так, каб падкрэсліць сваю прыроду. І на той раз яна была ў белай сукенцы, вязанай пруткамі. Ну проста лермантаўская Бэла. Яна ішла неяк крыху наводдаль ад яго. Менавіта такое ўражанне, быццам яна крадзеная. Быццам яе Віктар украў. Паклаў перак сядла і прыскакаў у Дом друку. Мы чамусьці ўсе амаль збянтэжыліся ад ейнай прыгажосці. Быццам захацелася крыху не тое, што параўнацца з ёй, а ейная прысутнасць, выразная прыгажосць падзейнічала на нас нібы прахаладай, захацелася не тое, што недзе схавацца, а неяк аддаць ёй усю тую вартасць, тую цану, забыцца на тое, што ты таксама жанчына, што таксама лічыш сябе прыгожай, на гэта так хацелася забыцца, і не было дазволу на параўнанне. Такой была Алена. Алена такой застаецца, я думаю. І абавязкова трэба сказаць рэдактару газеты «Народная воля», каб ён не забываўся, што гэта прыгожая жанчына, што ўзросту, які напісаны ў яе пашпарце, яна яшчэ не мае. Каб ён яе шанаваў, таму што ў любой сям'і, ці то ў газеце, ці то ў якім каралеўстве, — прыгожая жанчына заўсёды мае вялікую цану. Тых, хто працаваў у «Сельскай газеце», засталося вельмі мала, і ўсе мы з аднаго кошыка, з аднаго гнязда. Каб ён гэта памятаў.



Святлана

Мы сустракалі людзей разам з ёй, ідучы ў краму, ідучы з крамы, ідучы па вуліцы, зайшоўшы ў кафэ. Было так нечакана, калі я, напрыклад, вярталася да століка, атрымаўшы прыгатаваную каву, а ты ўжо сядзела за ім, у цябе ў руках была ружа, і ад цябе адыходзілі двое маладых мужчын. Было так неспадзявана, таму што была праца, было столькі дарог, столькі цяжкіх дарог. Была такая ахвярная праца твая.

І раптам над усім узышла ружа.

Потым заходзім у індыйскую краму, цябе пазнае прадавец, падыходзіць. Шукае паперу, лапае па кішэнях, хвалюецца. Потым дастае заліковую кніжку і кажа: напішыце тут аўтограф. І ты распісваешся ў заліковай кніжцы. Мне падаецца, што я б яму паставіла таксама залік па самаму важнаму прадмету, літаратуры. То мы ідзем па вуліцы, падбягае адна, другая жанчына. Гэта было кожны раз. Быў выпадак, і не адзін, калі нехта нешта стараўся адразу падараваць. У адным кафэ, куды мы зайшлі, гаспадыня, убачыўшы Святлану, папрасіла пачакаць. Яна пабегла і прынесла брошку, падаравала.

Падбягалі маладыя дзяўчаты і хлопцы. Самае цікавае, адзін з іх кажа: мне для мамы трэба, напішыце. Дзяўчынка кажа, што яе кніжкі дапамагаюць ёй жыць. Я гляджу на яе, яна такая маладзенькая, і думаю, можа быць, у яе што здарылася, які злом, іспыт, згуба, няшчасце? Мы заўсёды лічым, што яны жорсткія, што яны самавольныя, хіба і ім патрэбна дапамога!? То вось у краме: зноў выбягаюць, і адна прадавачка пазнае цябе. Яна заве іншых, і яны падбягаюць усе гуртам. Просяць сфатаграфавацца. І ты нікому не адмаўляеш, а я стаю такая, здуроная гэтымі модамі. І думаю, як ты выглядаеш? Хвалююся за цябе. Ты пра гэта ніколі не думаеш. Папрасілі, і ты не адмаўляеш. Цябе просяць сфатаграфавацца, і ты згаджаешся. Ты нікому ніколі не адмаўляеш, а я палохаюся — у чым ты? Звычайна ты ходзіш як жанчына, якая заўсёды ў дарозе, ты падарожніца. На табе надзеты нейкі лёгкі бушлат з капюшонам. Ты баішся ветру, цябе ён можа дагнаць на любой адлегласці, нават у памяшканні, у вобразе вентылятара. Вядома, людзі пазнаюць цябе лёгка, ты не носіш дарагога адзення, ты ніколі сябе не дэманструеш, ты проста падарожнік.

У мяне ўражанне, што ўвесь горад чытаў толькі «Время секонд хэнд». Выглядала гэта так, быццам я знаходжуся ў бібліятэцы, у чытальнай зале. Нехта ўстае, падыходзіць да аўтара і пачынае з ім размаўляць, браць аўтограф. Нехта сядзіць дома, чытае, глядзіць у акно, пазнае яе і выбягае па аўтограф. З аднаго дому, з другога, з дзясятага, з сотага. Нехта ідзе па вуліцы і таксама просіць сфатаграфавацца. Горад мяне проста здзівіў!

Я заўсёды, калі цябе нехта пераймае, адыходжу ўбок. За два гады ніхто ў яе не запытаўся: а хто гэта быў з вамі побач? Ніхто, ніхто не запытаўся: а хто з вамі, Святлана, увесь час побач? Як лёгка я сыходжу ўбок, як быццам знікаю. Гэта лёс, я часта ўваходжу ў свой цень, нібыта ўвесь час знаходжуся на самай сонечнай старане быцця.

Юля

Аксана мне шмат чытае. На гэты раз яна расказала мне пра жанчыну на фотаздымку, дзе яна сядзіць, ахінуўшыся пледам, п'е каву і паліць цыгарэту, недзе далёка на адпачынку. На фотаздымку, як Юлі самой падалося, яна падобная на жанчыну з партрэта Веласкеса. А мне адразу ўвачавідкі, ужывую ўбачылася, як яны сядзяць насупраць адзін аднаго і п'юць каву. І гэта раніца. І не ў якой там выманджонай сукенцы, як у Веласкеса, а проста з пледам на плячы, быццам усё так просценька. Мне захацелася б зараз узяць пэндзаль і размаляваць ейны твар іспанскімі фарбамі, а сама яна напісала ў Фэйсбуку проста, не ўжываючы аніякіх малявідлаў. Ніводнай плямы на ёй каляровай, не магла яна запэцкацца ніякай фарбай. Толькі ўся асветленая фразай: «Я — шчаслівая!» І тут я нечакана востра адчула: мне так захацелася паўднёвай цеплыні, прытулку. Захацелася недзе пасядзець, і каб мужчына абавязкова быў насупраць і плед на плячах. І каб гэта ўсё адбывалася ў нейкай далёкай чужой старане, дзе ты незнаёмы ўсім і вельмі вольны: не выбіраеш сукенку, ні ў чым не сумняваешся, не бянтэжышся, не губляешся. Ты ўпэўнена ў самой сабе, у ім. Ты пад пледам, быццам пад аховай, цябе не збянтэжыць чужы позірк. Табе шмат чаго дазволена ў жэсце, у слове, у манеры. Ты не адзінокая жанчына, ты не з сяброўкай, побач з якой ты іншы раз адчуваеш, быццам ты з двайніком, калі раптам збоку бачыш свой немалады твар, як адбітак у бягучай вадзе. Аксана быццам чытала мне на найпрасцейшай мове. А вось жа атрымалася, перадалося. Мне таксама вельмі захацелася пасядзець на тэрасе, вельмі-вельмі. Я іншы раз адчуваю, як балюча не хапае чалавека побач. Гэта адбываецца рэдка, але я раптам заўважаю побач з сабой пустое крэсла. Быццам у зусім нечаканым месцы. Так балюча, быццам мяне нядаўна вырвалі з сям'і, ці адлучылі з нейкага асяроддзя. А можа, я проста выпала, а павінна была быць менавіта на тым месцы, на тэрасе!

Потым я даведваюся, Аксана мне чытае, што ўсё адбывалася не ў Іспаніі, а ў Чэхіі. А ў маёй галаве ўсе помныя фарбы разліліся, перамяшаліся. І ў мяне намаляваўся вобраз Іспаніі. Я бачыла на фотаздымку: жанчына яна ігрывая, адкрытая, чорнавалосая. Ёй вельмі б пасавала, каб ён сам запрасіў яе станцаваць на тэрасе фламенка, а можа хто-небудзь з іншых мужчын, з іспанцаў! І ёй бы пасавала замест банта, як у жанчыны Веласкеса, прышпіліць у валасы чырвоную кветку.

Я з ёй зусім незнаёмая. Іншы раз ад людзей, якіх не ведаеш, нават на вялікай адлегласці можна зарадзіцца іх энергіяй. Нібыта атрымаць запрашэнне, хуценька пераапрануцца і сесці за іх столік. Я ўпэўнена, яны сядзяць, размаўляюць, рассыпаючы вакол сябе буйныя шкляныя пацеркі. Іх хочацца падняць і начапляць на нітку!

Я не адчуваю сябе адзінокай. Гэтае пачуццё прыходзіць вельмі рэдка. Я наогул лічу, што адзіноты не існуе. Як сказаў адзін грэчаскі паэт: калі недзе на свеце маладая маці гушкае дзіця, калі недзе на лузе пчала збірае пылок, калі вецер расхінае бутон кветкі, чалавек не можа адчуваць сябе адзінокім.

Шляхі жыцця

Разуменне сутнасці часу Алесем Разанавым

Аляксандр ДАКУКІН

Развей няведання туман
і адкажы нам,
непазбежнае,
ці гэта час належыць нам,
ці гэта мы яму належныя?
А. Разанаў

Усе мы заўсёды знаходзімся ў непарыўнай сувязі з часам, які знітоўвае паміж сабою падзеі, робячы тым самым жыццё разнастайным і нечаканым.

Такая надзённая, але абстрактная з'ява, безумоўна, не магла пакінуць абыякавымі мысляроў і пісьменнікаў, якія ўжо не адно стагоддзе імкнуцца ўсвядоміць няўлоўную сутнасць часу, атаясамліваючы яго з нечым Боскім ці абвяшчаючы «звычайнай» фізічнай канстантай або ўвогуле падкрэсліваючы неспасцігальнасць дадзенай з'явы. Так, Гарацый звяртаў увагу на хуткаплыннасць жыцця і разбуральную моц часу, кажучы: «Чаго толькі не аслабляе ўсёразбуральны час?» ці «Чаму не пагражае пагібельны час?». Пагэтаму «што будзе заўтра, сцеражыся разгадваць, і кожны дзень, лёсам нам пасланы, лічы за шчасце». Філосаф заклікаў нас атрымліваць асалоду ад кожнай хвіліны, а жыццё напоўніць слодыччу і прыемнасцю. Менавіта ён аўтар знакамітага выразу aurea mediocritas («Залатая сярэдзіна»), што ўвасабляе сабой жаданне пазбягаць залішніх цяжкасцяў ды імкненне да памяркоўнасці, спакою. Шмат разважаў пра час і Марк Аўрэлій у сваіх «Роздумах»: «Успомні аб сутнасці ў яе цэлым: у якой нікчэмнай долі ты ўдзельнічаеш у ёй; пра час у яго цэлым, ад якога табе дадзены толькі кароткі і мімалётны тэрмін; пра лёс: якой нязначнай частачкай яго ты з'яўляешся!». Б. Паскаль увогуле зводзіў час да пэўных лічбаў: «Тэрмін на зямлі сто гадоў... Чаму прырода спынілася на гэтым ліку, а не на іншым, хоць іх незлічонае мноства, і няма падстаў выбраць гэты, а не той, і гэтаму ліку аддаць перавагу, а не таму».

Цікавы погляд на час падае і Алесь Разанаў, адзначаючы яго цыклічнасць, спалучаную з непарыўнасцю і зменлівасцю. Гэта дае падставу праводзіць паралелі з традыцыямі філасофіі Усходу.

Традыцыйна час падзяляецца на мінулае, сучаснасць і будучыню, але ці правамерная такая дыферэнцыяцыя? Няўжо мы пражываем пэўную падзею, а пасля пакідаем назаўсёды ў сховах памяці, незваротна імкнучыся ў вір новых імгненняў? Ці ўсё-ткі захоўваем сувязь, еднасць з ранейшым?

Тут толькі лета і зіма,
світальны позірк,
сон глыбокі,
і белаплынныя афлокі,
і міг, што быў
і ўжо няма
(«Танец з вужакамі: выбранае»)

Як бачна, аўтар падкрэслівае, што нешта перажытае намі ўяўляе толькі імгненне. Але імгненне гэтае не знікае бясследна, а працягвае існаваць побач з сучаснасцю:

Мінула, знікла...
І ў траве
прамень бязбоязна іграе.
Але мінулае жыве,
яно за намі назірае.
(«Танец з вужакамі: выбранае»)

Таму нельга дакладна правесці межы пры падзеле часу на пэўныя часткі, бо перажытае можа зноў з'явіцца ў жыцці, толькі ўжо ў пераўвасобленым выглядзе. Напрыклад, назва кнігі Алеся Разанава «Шлях-360» адлюстроўвае часавы «велізарны супярэчлівы кругазварот сэнсу і бяссэнсіцы, гармоніі і хаосу, вечнасці і мімаходнасці, духоўнага і бездухоўнага». Мы пражываем адзін такі кругазварот, а затым ён пачынаецца зноў, але ўжо насычаны мноствам чагосьці іншага. Можна ў сувязі з гэтым казаць пра цыклічнасць часу, якая, аднак, не парушае яго непарыўнасці, а дапамагае ў імкненні далей. Нават, калі пэўны цыкл пашкодзіцца, усеабдымнасць часу не зменіцца:

Выбіўся з рытму часу –
падаю
ў бездань часу.
(«Танец з вужакамі: выбранае»)


Для Алеся Разанава традыцыйным увасабленнем часу і гісторыі з'яўляецца вобраз шляху. Чалавек безупынна крочыць па гэтай дарозе — перамяшчаецца ў часе — і пакідае сляды, пад якімі разумеюцца пэўныя падзеі мінуўшчыны і сучаснасці. Навакольная рэчаіснасць уся ахутаная безліччу самых разнастайных шляхоў. Кожны абірае сабе пэўную дарогу і пацiху ідзе па ёй, паступова пераходзячы на ўсё больш і больш шырокія і шматлюдныя. Застаюцца ззаду разнастайныя рэчы, незлічоныя багацці, нават цэлыя эпохі, а людзі ўсё працягваюць крочыць па шляхах, пакідаючы адбіткі сваіх слядоў на паверхні гісторыі: «Адзінага, каго яна [дарога] не можа пакінуць, — гэта чалавека: калі рухаецца ён — рухаецца і яна, калі спыняецца ён — спыняецца і яна. Ён — яе другое «я», яе спадарожнік і правадыр, які дырыжуе, як ёй ісці — таропка ці паволі, ціха ці гучна». Як сцвярджае Алесь Разанаў, дарога і чалавек, што рухаецца па ёй, заўсёды цесна звязаныя між сабою: «Усё, што здараецца з дарогай, здараецца і з чалавекам, і ўсё, што ні здараецца з чалавекам, здараецца якраз у дарозе, бо сама прырода дарогі — здарацца, «здарагацца»». То бок, сапраўды, час-дарога ўплывае на чалавека і ягонае жыццё, але і сама гэтая няўлоўная з'ява пэўным чынам абумоўліваецца паводзінамі асобы. Шляхі доўжацца, а людзі працягваюць па іх крочыць. Такое становішча адбываецца здаўна. З'яўляюцца і знікаюць усё новыя пакаленні людзей, прычым пры знікненні яны не пакідаюць адрасы, па якіх іх трэба шукаць. Застаюцца толькі адбіткі на вечным шляху, на вечнай «торы чалавечай гісторыі». Менавіта здольнасцю захоўваць успамін аб мінулым і даваць нам магчымасць да яго дакрануцца і каштоўная гісторыя-дарога. А які ж успамін выбраць з бязмежных сховаў мінулага жыцця — гэта поўнасцю залежыць ад лёсу і наканавання: «Дарога найдаражэйшая госця: яна нясе людзям навіны, нясе дары, нясе радасць і гора, трагедыю і жарт, гатовая, як торг, заўтра змяніць іх на процілеглае».

Час-дарога ўплывае на чалавека і ягонае жыццё, але і сама гэтая няўлоўная з'ява пэўным чынам абумоўліваецца паводзінамі асобы. Шляхі доўжацца, а людзі працягваюць па іх крочыць

Дадзеная вобразнасць і якасці, якімі надзяляецца час, перагукваюцца з пэўнымі ўяўленнямі, характэрнымі для філасофскіх канцэпцый Усходу. Творы Алеся Разанава, на думку Т. Лозкі, «варта разглядаць у сувязі з такімі напрамкамі рэлігійна-філасофскай думкі Усходу, як даасізм і будызм». У іх аснову пакладзены прынцыпы старажытнакітайскай натурфіласофіі і вучэнне Інь-Ян. Сутнасць апошняга ў тым, што «...нічога не можа існаваць у часавай катэгорыі «заўсёды», нішто не з'яўляецца па сваёй сутнасці дрэнным ці добрым. Такія традыцыйныя паняцці, як «дабро» і «зло» ва ўсходняй філасофіі — гэта дуалізм, які залежыць ад адносінаў чалавека да падзеяў і сваіх жаданняў, адзнакі «дрэннае»-«добрае» насамрэч не з'яўляюцца ўласцівасцямі, суадноснымі з прыродай рэчаў» (Т. А. Лозка. Творчасць А. Разанава ў святле ўсходняй філасофіі // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. — 2006, № 1).

Гэтая дваістасць пранізвае не толькі час, прастору, але нават і саміх нас: «Я аддзяліў слодыч ад горычы, асалоду ад пакуты, рай ад пекла — і кветкі сталі мяне паіць толькі салодкім нектарам, а дрэвы частаваць толькі райскімі яблыкамі. Але чым далей, тым з усё большай трывогай я ўслухоўваюся ў тую другую палову падзеленага мною свету. «Яшчэ не позна, — мне шэпчуць нейчыя галасы, — выпі кубак горычы, якою перапоўніліся кветкі, — і яна ацэліць цябе, саступі ў пекла — і яно цябе выратуе...» Я вагаюся, туляюся ў сваю палову і не адважваюся зразумець, што я ўжо асуджаны». Таксама пра дуалізм і часу, і чалавечай сутнасці распавядаюць наступныя радкі:

Куды? Адкуль?.. —
маўчанне.



Фота kolyaseg.com

Не дасць адказу час.
Стаю — і сам пытанне,
іду — і сам адказ.
(«Танец з вужакамі: выбранае»)

У паэтычным свеце, створаным пісьменнікам, Т. Лозка бачыць таксама і паралелі з даасізмам: «У творчасці А. Разанава рэалізуецца асноўнае палажэнне даасізму — існаванне Даа. Даа ўвогуле не паддаецца вызначэнню, семантыка слова ўключае «руханне» свету, шлях жыцця. Гэтае слова па-кітайску азначае «шлях», «дарогу»».

Уплыў даасізму ў Алеся Разанава можна адчуць таксама і на ўзроўні паэтыкі, для якой уласціва ампліфікацыя вобразна-выяўленчых сродкаў, багацце і разнастайнасць іх: сімвалы, паралелізмы, алегорыі, параўнанні і інш. Асабліва яскрава гэта можна ўбачыць у вершаказах. Напрыклад, даволі цікавы вершаказ «Век»:

Век спалучаны з усімі істотамі, але найшчыльней — з чалавекам. Ён выяўляецца — і чытаецца — у яго твары і пастаці, і калі па якой-небудзь прычыне век парушаецца, то *нявечыцца* і чалавек. Век не аднолькавы са стагоддзем: ён утрымлівае ў сабе сваю меру, якая вымяраецца не проста часам, а самой непаўторнасцю часу, — і свой вектар, які скіроўваецца з пачатку ў канец, з маладзіка ў ветах, з раніцы ў вечар, з жыцця, якое падуладна зменам, у жыццё, якое зменам не падуладна, — у вечнасць. Калі гарыць свечка, яна гарыць век, калі расце дрэва, яно расце век, калі жыве чалавек, ён жыве век, і які б гэты век ні быў — кароткі ці доўгі, роўны ці пакручасты, — ён усё роўна вялікі.

Разнавіднасць будызму — дзэн-будызм — уяўляе сабою не рэлігію і не філасофію, а «прапанае своеасаблівы спосаб мыслення: ён адмаўляе зносіны, якія могуць адбывацца толькі з дапамогай канвенцыянальных знакаў і якія прадстаўляюць свет у абстрактным лінейным перакладзе»; з дадзеным кірункам «творчасць А. Разанава лучыць этычная арыентацыя, увага да ўнутранага свету асобы» (Т. Лозка). Прыгадаем тут наступныя словы паэта: «Палову жыцця падаюся ў свет, палову — варочаюся са свету, палову жыцця пішу на дарозе свае імёны, палову — закрэсліваю напісанае, палову жыцця расту ад зямлі, палову — расту з зямлёю: і ўсё менш ува мне мяне, і ўсё больш бязмежжа». Пададзенае меркаванне зноў падкрэслівае думку, што падзяліць час на пэўныя адрэзкі можна толькі ўмоўна. Безумоўна, нельга поўнасцю атаясамліваць творы пісьменніка з усходняй філасофіяй, але пэўнае падабенства назіраецца.

А. Разанаў адлюстроўвае таксама і лёсавызначальнасць часу: «Колішні брыгадзір паляводчай брыгады Іван Шаўкаловіч, па-вулічнаму Гуговіч, казаў, што ён пражыве семдзесят два гады. Столькі разоў адстукаў яму ў часы яго маладосці, яшчэ пры Польшчы, на адным спірытычным сеансе драўляны столік. І з ім, і вакол яго ўсё мянялася неаднаразова, і ў чужых землях, і ў сваёй зямлі гінулі аднавяскоўцы, а Іван Гуговіч, нібы зарок, насіў у сабе тую звестку, якая прыйшла да яго з яго канца... І калі па вёсцы блукалі ўпартыя чуткі: будзе вайна, і ў ёй аніхто не ўцалее, а ў краме бралі мяшкамі запалкі, мыла і соль, я не згаджаўся: не будзе — Івану Гуговічу яшчэ далека да сямідзесяці двух гадоў. Загінуў ён неяк дзіўна. Паехаў на возе ў лес, а перад мостам чамусьці збочыў, паехаў па-плыткаму — уброд, праз раку... Там і знайшлі яго: на беразе ходзіць конь, воз у вадзе, а пад возам Іван Гуговіч, адно вытыркаецца, у кола ўчапераўшыся, рука... Рознае меркавалі пра выпадак гэты. А я прыгадаў ягоны расказ, якому і сам ён здзіўляўся, нібы не верачы, як гэта можа быць... Ён не дажыў паўгода да тэрміну, што яму тады налічыўся, — мабыць, апошні раз столік стукнуў цішэй» («Танец з вужакамі: выбранае»). Але нельга казаць, што чалавек цалкам залежыць ад часу. Наадварот, мы можам у любую хвіліну зрабіць сваё жыццё інакшым:

Але чакай,
няўмольны час:
я маю права
ўсё закрэсліць
і потым
нанава пачаць.
(«Танец з вужакамі: выбранае»)

Як выяўляецца, бачанне часу у Алеся Разанава вельмі шматграннае. Час уяўляе сабою не проста лінію, а сукупнасць пэўных жыццёвых цыклаў, якія несупынна змяняюцца, імкнучыся далей у існае. Найбольш адпаведным вобразам для адлюстравання супярэчнасцяў дадзенай з'явы падаецца вобраз шляху, але гэты шлях жыцця дуалістычны, то бок спалучае і адмоўнае, і станоўчае. Сапраўды, можна поўнасцю пагадзіцца з пісьменнікам, які трапна характарызуе час як няўлоўны і няўмольны.

Навагодняе чытанне: «Дзеяслоў-97»

Неўпрыкмет мінуўся яшчэ адзін год стваральнага жыцця ў беларускім сучасным літаратурным працэсе.

Шмат напісана і нямала выдадзена. І нават калі браць па вялікім рахунку — сярод усяго гэтага ёсць таленавітыя, адметныя і вартыя шырокай чытацкай увагі творы нашых паэтаў, пісьменнікаў… і крытыкаў.

Хоць чамусьці менавіта апошнім, бедным, якраз і дастаецца найбольш таго самага пякучага выспятку. За што? А за тое, што ўсё-ткі не ўсё напісанае і выдадзенае вартае чытання і ўхвалы… М-да…

Іншая справа — часопіс. Да прыкладу — «Дзеяслоў». Тут ёсць разнастайны жанравы выбар. Таму нешта ды знойдзецца для чытання на ўсякі густ. Нават для самых што ні на ёсць літаратурных гурманаў. Ну вось хоць бы і ў гэтым 97-м (6-м) нумары.

Перадсвята-навагодняе выданне адкрываецца публікацыяй перастварэння «Каляднай казані» Лявонція Карповіча са старабеларускай мовы, зробленае вядомым сучасным паэтам Алесем Разанавым. Л. Карповіч (1580–1620) — паэт-публіцыст і вядомы царкоўны дзеяч (узначальваў антыўніяцкае супрацьстаянне ў ВКЛ), народжаны ў Пінску (памёр у Вільні); быў архімандрытам брацкага праваслаўнага манастыра Святога Духа ў Вільні, таксама меў датычнасць да навучальнай і выдавецкай дзейнасці, у прыватнасці, да выдання кніг Мялеція Смятрыцкага. Перастварэнне, як мне падаецца, надало «казанню» свецкасці, жывой логікі, душэўнага цяпла і той прастасці, што закранае глыбіню сутнасці зямнога чалавечага жыцця і яго духоўнага працягу ў боскай вечнасці…

Нізку адмысловых вершаў рознай тэматычнай скіраванасці — ад грамадзянска-палітычных да пачуццёвай лірыкі — прапануе чытачу Уладзімір Някляеў. Творы — дасканалыя па версіфікацыі, вытанчаныя па майстэрству і стылю, напоўненыя зрушлівым і ўзвышаным духам, аднак папазвальныя і прадказальныя карэннымі праявамі, што вынікаюць са шматгадовага вопыту літаратурнай творчасці і грамадскай працы. Вось адзін з такіх вершаў:

Сарвалася ў бездань дарога,
І я азірнуўся ўначы:
За спінай маёй анікога.
Хоць крыкам крычы —
Ніхто мне вяроўку не кіне,
Ніхто не працягне руку!..
А недзе
Агонь у каміне.
Каханая на скразняку.

Вельмі актыўны апошнім часам пісьменнік Віктар Казько. Чытачам прапануецца аповесць «Як я «рабіў» шпіёнам у Нью-Ёрку». У гэтым тэксце так шмат фактычнага матэрыялу і фігуруе каля дзясятка сапраўдных імёнаў, таму я не ведаю, чаму ён названы аповесцю, а не, скажам, эсэ альбо яшчэ якім мемуарным жанрам. Аднак — аповесць. Пра што? Пра былога савецкага чалавека і найбольш пра сябе самога. Пра чалавека Хрыста, які быў у кроку ад чалавека Юды… Пра паўсядзённую працу органаў дзяржбяспекі (КДБ) і спробы схілення да працы на гэтыя органы. Аўтар зазначае:«Лічыцца, што самая старажытная на зямлі прафесія — прастытуцыя. Падман. Выведка — яна прастытуткай была ці не раней. Калі ўжо не блізняты яны, то, бясспрэчна, аднаяйкавыя родзічы». І вось пад яе пільным наглядам і адбывалася драматычная эвалюцыя савецкага чалавека — ад грамадзяніна да асобы. В. Казько, не шкадуючы слоў, падрабязна апісвае гэтае калючае прадзіранне праз заслоны знешне аточанага ад усяго свету жыцця, а таксама не хавае перанесеных пакут, і ўрэшце выкрывае і высмейвае псеўдакамуністычныя рэаліі і вычварэнні сацыялістычнага будаўніцтва. Ну і асноўная гаворка ў аповесці — пра ўдзел пісьменніка ў асамблеі ААН у Нью-Ёрку якраз на пачатку гарбачоўскай перабудовы.

Як мне здаецца, то на такія доўгатэрміновыя мерапрыемствы ў самае логава капіталізма пасылаліся ўсё-ткі правераныя людзі. Не думаю, што В. Казько нейкім дзіўным чынам пазбег гэтага. Але ўнутрана аўтар усё ж заставаўся натурай творчай і таму не да канца вытлумачальнай, а да ўсяго яшчэ і глыбока пераканаым беларускім нацыянальным чалавекам. Як ён піша:«Сапраўды, усё таемнае з цягам часу становіцца яўным, як шыла ў мяшку: згвалтаваная і падманная гісторыя, сапраўдны кошт усіх рэвалюцый, справядлівых і несправядлівых войнаў, крывавая, забітая ў Гулагах праўда. І гэта толькі здаецца, што ўсе мы розныя і таемныя. Карэннае, нашчадкавае, у барадзе Карла Маркса не схаваеш, у дрыгве і багне не стоіш, чужое ёсць чужое, сваё ж заўсёды бярэ верх, кілой яно вылпрэ з цябе. Кожны на зямлі смяецца, плача, робіць і нават крадзе і хлусіць так, як бацькі і бацькаўшчына запаветавалі». І ў той жа час пісьменнік шчыра прызнаецца, што ён «не жадаў выходзіць з дваццатага свайго веку — вяскова вернасць. Вернасць свайму стойлу, балоту і часу». Аднак жа паступова празарэнне адбывалася… І ўжо з сённяшняга часу вымалёўваецца гэты наш ментальны і, дасць Бог, неўміручы гістарычны вобраз: «І я іду, іду па сваім жа следзе праз камяні спатыкання, па сцежках, барах і дубровах, багне і дрыгве дзяцінства. Па апякаючай і чаруючай нас памяці, прагі загадак, сакрэтаў таямніц, нахай і марна прывідных. Іду на чужыне і дома, па тым, што наканавана і загадана мне вечнасцю — быць шпіёнам, хаця на кожным кроку выракаюся гэтага, толькі ў галаве трымаю: назіраць і бачыць, слухаць і маўчаць. Чым не наш з вамі партрэт, партрэт беларуса сёння».

Друкуюцца ў апошнім нумары «Дзеяслова» 2018 года новыя вершы Леаніда Галубовіча і Валянціны Аксак. Калі ў першага пераважае традыцыйны песімізм і самотлівая адзінота, дык у яго зямлячкі з-пад Нясвіжа больш існыя і глыбокія тэмы і матывы замешаныя на хрысціянскіх традыцыях і нярэдка супярэчлівых ім сучасных успрыманнях гэтага свету, бо «уцёкі ад дзікае слівы// ў завінены рай// апынуліся бегам// па трэнажорнай дарожцы» (маюцца на ўвазе папярэднія зборнікі паэткі «Дзікая сліва» і «Завінены рай»). Бо:

Пасталела нарэшце —
ужо не азіраюся.
Там нічога няма.
Нават жменькі попелу
са спаленых дзённікаў.
Але палюбіла чытаць
чужыя ўспаміны.
У іх так прыгожа
распавядаецца пра тое,
чаго не было.
І я гэта помню.
Даравацъ —
не значыць забыць.
Уважліва чытаю
між радкоў.

Неяк цяжка давялося мне падмастакоўвацца да ўспрымання дзіцячай прозы Сяргея Рублеўскага, да гэтага ягонага дзедаўскага стылю. Я маю на ўвазе аповед пра сабачку, унукаў і іх шчаслівага дзядулю «Тузік-Гузік». Хоць у рэшце рэшт пэўнае паразуменне адбылося.

Алесь Бычкоўскі публікуе заканчэнне свайго фэйсбучнага рамана «Край ваўкалакаў». На першы погляд, прыземленыя, але жывыя натуральныя запісы беларускага жыцця ў правінцыйным гарадку. Ёсць звычайныя шараговыя нататкі, але сустракаюцца і адметныя, можна сказаць, афарыстычныя і філасофскія, як вось гэтыя:

«Дзядуля мой з Палесся быў вернікам. Бывае, паслухае вядзьмарскія заклёны, кульне гранчак самагонкі і абавязкова зап'е свянцонай вадой…»;

«Працаваў аператарам вёрсткі ў газеце. Калі раздрукаваны аркуш фармату А3 з маёй вёрсткай выпаўзаў з прынтара ў рукі, заўсёды адчуваў сябе Францішкам Скарынам».

З чаго ж «вырастае» і складваецца гэты «раман»? З непахіснай любові аўтара да беларушчыны, неабыякавасці да сучасная парадаксальная жыцця і вернасці свайму літаратурнаму пакліканню. Ну і — гумару, іроніі ды правакацыйнасці, як жа без гэтага можа трывацъ прывязка да фэйсбука:

«Чамусьці я ўпэнены: каб стаць пісьменнікам у нашай краіне, можна ўвогуле нічога не пісаць. Замест творчасці трэба часцей рабіць сэлфі з помнікамі Купалу-Коласу, святкаваць чарговыя ўгодкі Міцкевіча-Багдановіча, наведваць магілы Караткевіча-Янішчыц, бываць на шматлікіх прэзентацыях, даваць аўтарытэтныя каментары ў сацыяльных сетках і трубіць-гудзець-трэсці-звінець пра гэта на ўвесь свет праз фэйсбук. І ўсе пачнуць лічыць цябе творцам, паслядоўнікам традыцый айчыннай літаратуры…»

Як заўжды, іранічна-аптымістычны Андрэй Хадановіч надае нашай — то блазнавата-шумнай, то сумнавата-шчымлівай — паэзіі пэўнага еўрапейскага глянцу і адпаведнага настрою. Для ўзору хоць бы гэтая страфа:

Неймаверны горад сышоў са сваіх графіці
і вядзе ў ноч музеяў, бо кожная ноч — музей:
«Нарадзіўся — расці вялікім, мой неафіце,
адрывайся, спявай і танчы, не цверазей.

Друкуюцца побытавыя і падарожныя — гэтым разам амерыканскія — запісы з нізкі «Уладзевы гісторыі» Уладзіміра Сіўчыкава («Стрыптыз каля Белага Дома»). Прысутнічае фактура і жывы досціп. Тэксты для разняволенага чытання.

Вершы нашай беларускай палтаўчанкі Іны Снарскай, як заўсёды, эмацыйна-душэўныя і мройна-праніклівыя. У іх ёсць ужо даволі разняволены украінскі росхрыст дум і пачуццяў, але засталіся відавочныя і згадлівыя беларускія мяккасць, дабрыня і спагадлівасць.

Паляцелі на поўдзень гусі,
Развіталіся да вясны.
Уплятаю я сны Беларусі
У свае даматканыя сны.

У рубрыцы «Дэбют» маладая паэтка з Магілёва (цяпер вучыцца ў польскім горадзе Лодзь) Яніна Асіпцова спрабуе згарманізаваць спакойную разважлівасць і жарстлівую пачуццёвасць у своеасаблівых вершаваных маналогах, раскрываючы прасторані сваіх няспраўджаных мрой і няўрымслівай закаханасці… Іншыя з іх зацягнутыя і блізкія да празаічных высноў і сыходаў. Аднак літаратурная і паэтычная адоранасць аўтара несумнеўныя.

Публікуецца кідкая на таленты ды імёны падборка перакладаў з сучаснай польскай паэзіі, прапанаваная Андрэем Хадановічам. Прачытаўшы, думаеш, а добра было б, каб і нашых лепшых паэтаў прадсталялі за мяжой гэтак жа гожа і паўнавартасна. Сярод перакладзеных на беларускую мову Войцех Бановіч, Ілона Віткоўска, Эва Ліпска, Юлія Фядорчук. З вершаў В. Бановіча:

Напішы паэту.
Вышлі паштоўку
або напішы ў фэйсбуку
што яго сляпая ўпартасць
табе патрэбная.

Друкуецца ўрывак з рамана вядомага ўкраінскага паэта і пісьменніка Аляксандра Ірванца «Харкаў-1938» у перакладзе заўчасна памерлага нашага таленавітага творцы Уладзіслава Ахроменкі з яго кароткай прадмовай да тэкста.

Гэта фантэзійны раман пра магчымую некалі Украінскую Рабоча-Сялянскую Рэспубліку. Нездарма ва ўступным слове перакладчык задаецца іранічным пытаннем: а якой магла б быць Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), калі б у свой час перамога аказалася на яе баку?

Выбітны фалькларыст і перакладчык Уладзімір Васілевіч публікуе (з разгорнутай біябібліяграфічнай прадмовай) побытавы з дамешкам маральнай і матэрыяльнай культуры людзей вёскі Камаровічы, што на Мазыршчыне, нарыс Эмы Яленскай у перакладзе з польскай мовы. Як зазначае перакладчык, гэтая «праца стала, можна сказаць, універсальным комплексным даследаваннем, пабудаваным на прыкладзе адной вёскі, дзе знайшло месца адлюстраванне яе гісторыі, геаграфіі і культуры яе насельнікаў».

Штрыхі да творчага партрэта вядомага пісьменніка, рэдактара і энцыклапедыста Барыса Сачанкі «Служыць Бацькаўшчыне» публікуе літаратар Анатоль Астапенка.

А паэт Васіль Жуковіч прапануе чытачам часопіса цікавы рознабаковы артыкул пра жыццё і творчасць вядомага паэта Анатоля Вярцінскага.

Друкуюцца ўспаміны тагачаснага падлетка «Дарагія цені» Паўла Ляхновіча — пра Ракаў, яго ваколіцы, людзей і іх жыццё ў далёкіх ужо 1960-х гадах не так даўно мінулага ХХ стагоддзя.

Наш сучасны філосаф Валянцін Акудовіч працягвае публікацыю хронікі беларускага інтэлектуала — гэтым разам у асноўным гаворка вядзецца пра літаратурна-філасофскі сшытак «ЗНО», што выдаваўся пры тыднёвіку «Культура».

Паэт і нацыянал-патрыёт Славамір Адамовіч публікуе згадкі «Кулакі дабра» з новай уласнай кнігі «Лісты да Зянона». Тэксты ў выглядзе дзённікавых нататкаў у Славаміра, як заўсёды, гарачыя, правакацыйныя і палемічныя. Вартае чытанне.

Літаратуразнаўца з Віцебска Ірына Саматой друкуе артыкул пра мастацкі свет паэта і перакладчыка Уладзіміра Папковіча.

Леанід Галубовіч рэцэнзуе кнігу Віктара Казько «Казань пра ката, каторы смяяўся».

Апроч усяго гэтага змястоўнага, напрыканцы змяшчаецца міні-анатацыйная выдавецкая рубрыка «Дзеяпіс» ды змест часопіса за 2018 год.

Ну, дык чытайма лепшае!

ЛеГал

Юрысты і «Гары Потэр»

На сайце індыйскага дзяржуніверсітэта — Нацыянальнага ўніверсітэта юрыдычных навук у Калькуце (NUJS) — з'явілася афіцыйнае паведамленне аб спецыяльным курсе.

Ён прапанаваны для вывучэння выдатнікамі 4-га і 5-га курсаў навучання прававых прынцыпаў чароўнага свету Гары Потэра і мае назву «Узаемадзеянне паміж фантастычнай літаратурай і законам: асаблівы погляд на патэрыяну Роўлінг». Працяглacць курса — 45 гадзін.

Праграма NUJS разлічана на зімовы семестр 2018/2019 навучальнага года. Студэнтам прапануюць разгледзець сітуацыю з рабствам хатніх эльфаў, вывучыць выкарыстанне забароненых законам заклёнаў, дыскрымінацыю пярэвaратняў, а таксама немагчымыя ўмовы ўтрымання вязняў у чароўнай турме Азкабан, дзе з іх «высмоктваюць» душу і даводзяць да самагубства.

Акрамя таго, увага будзе нададзена пытанням бюракратыі ў міністэрстве магіі, эканоміцы (на прыкладзе банка Грынгатс), прапагандзе ў афіцыйных СМІ (на прыкладзе газеты «Штодзённы прарок»), а таксама падрабязна разглядаюцца ўзаемаадносіны чараўнікоў і маглаў (звычайных людзей).

Для вучобы студэнтам неабходна прачытаць 7 асноўных кніг цыкла пра Потэра Джоан Роўлінг як мінімум два разы, а прагляд кінакарцін патэрыяны рэкамендуецца па жаданні. Для азнаямлення да курсу прыкладаюць спіс з 17-ці навуковых прац, якія прысвечаны розным аспектам права ў серыі кніг вядомай брытанскай пісьменніцы.

Выкладчык навучальнай установы Шувік Гуа чакае, што пасля праходжання курса навучэнцы адказней паставяцца да сацыяльных праблемаў у Індыі, дыскрымінацыі, катаванняў, рабства, а таксама да пытанняў мірнага суіснавання народаў Індыі і прадстаўнікоў розных рэлігій.

Жуль Верн пісаў вершы!

Паводле паведамлення выдання «Ex Libris», у бліжэйшы час выдавецтва «Прэстыж БУК» выпусціць кнігу Жуля Верна «Рассеяны агонь».



Аднак гэта будзе не фантастычны або прыгодніцкі раман вядомага французскага пісьменніка, а зборнік паэтычнай спадчыны. Так, гэта не памылка, класік прыгодніцкай літаратуры ў юнацкія гады сапраўды пісаў вершы.

Зрэшты, гэта і зразумела, паколькі такой рамантычнай натуры, якая пакінула нам велізарную творчую спадчыну ў жанры фантастычнага і прыгодніцкага вострасюжэтнага рамана, павінна быць «уласцівая» і паэзія. Аднак на фоне яго белетрыстыкі, юнацкая лірыка мала вывучана і незаслужана забытая.

Справядлівасць і вырашыў аднавіць паэт і перакладчык Яўген Віткоўскі, які ініцыяваў ідэю стварэння паэтычнага зборніка знакамітага француза, а сам праект быў рэалізаваны дзякуючы дапамозе ўдзельнікаў семінара «Стагоддзе перакладу» — невялікага калектыву перакладчыкаў з французскай на рускую мову, якія падрыхтавалі да друку зборнік вершаў Жуля Верна.

Лірыка французскага аўтара налічвае звыш 180 твораў — ад невялікіх накідаў і вершаў «з нагоды» да буйных баладаў і паэм.

Музей Салжаніцына

Запрацаваў музей-кватэра Нобелеўскага лаўрэата Аляксандра Салжаніцына.

У Маскве на Цвярской вуліцы, у кватэры, якая знаходзіцца на першым паверсе корпуса 8 дома 12, знакаміты аўтар пражываў да 12 лютага 1974 года, калі быў арыштаваны пасля публікацыі за мяжой рамана «Архіпелаг Гулаг». Яго абвінавацілі ў здрадзе радзіме, а ўжо на наступны дзень ён быў высланы з Савецкага Саюза. Пазней пісьменнік, калі змог вярнуцца на радзіму, пражываў у гэтай жа кватэры з 1994 года па 2002-і.

У цырымоніі адкрыцця музея прымалі ўдзел удава літаратара Наталля Салжаніцына, намесніца мэра Масквы Наталля Сергуніна, грамадскія дзеячы. «Думаю, што гэты музей будзе вельмі запатрабаваны, — адзначыла высокапастаўленая чыноўніца маскоўскай мэрыі. — Дакрануцца да вялікага можна не толькі праз творы, але і праз такое адчуванне эпохі, побыту».

У экспазіцыі музея-кватэры паказаны этапы жыцця і творчасці Салжаніцына. Прастора падзелена на тэматычныя секцыі: «Кухня Салжаніцына», якая узнаўляе непаўторную атмасферу жыцця інтэлігенцыі 1970-х гадоў, зала «Набеліяна», «Арышт», «Праца над «Чырвоным колам»», «Кабінет Салжаніцына 1990-х гадоў».

Прэміі «Рускі Букер» няма

Літаратурны сакратар вядомай прэміі «Рускі Букер» прафесар Ігар Шайтанаў паведаміў, што адна з самых сталых незалежных літаратурных прэмій Расіі не змагла знайсці спонсараў і была вымушана запусціць працэс закрыцця.

Традыцыйна — на працягу 26-ці гадоў — у пачатку апошняга месяца года аргкамітэт прэміі «Рускі Букер» праводзіў урачыстую цырымонію ўручэння прэстыжнай літаратурнай узнагароды. Мінулай вясной прадстаўнікамі прэміі было абвешчана аб вымушанай паўзе з прычыны праблем з фінансаваннем, пры гэтым узніклую праблему паабяцалі вырашыць да канца лістапада, максімум — снежня, аднак спонсары так і не знайшліся.

Як адзначыў І. Шайтанаў, надзея памірае апошняй, напэўна таму дагэтуль працягваюцца тэлефонныя званкі, прызначаюцца сустрэчы, але хоць нейкай канкрэтыкі ці пэўнасці да гэтага часу няма. А гэта значыць, што «зачыняецца» не толькі прэмія, але і фонд «Рускага Букера», і па-новаму «закруціць гэтае кола» наўрад ці атрымаецца.

10 гадоў за эратычны раман

За стварэнне і распаўсюд эратычных раманаў на 10 гадоў турэмнага зняволення асуджаная кітайская пісьменніца Цяны.

Гэта справакавала шырокі грамадскі рэзананс і дэбаты карыстальнікаў у Інтэрнэце з нагоды сур'ёзнасці прысуду. Было зафіксавана больш за 1,8 мільёна паведамленняў, якія выкарыстоўваюць хэштэг #Tianyi на Weibo, кітайскай версіі Twitter. Большасць карыстальнікаў абараняюць аўтара.

З паведамленняў кітайскіх дзяржаўных СМІ вынікае, што Ліу, якую многія ведаюць пад інтэрнэт-псеўданімам Цяны, была арыштаваная паліцыяй правінцыі Аньхой ва Усходнім Кітаі ў 2017 годзе пасля поспеху яе гомаэратычнага рамана «Занятасць». Калі яе кніга атрымала шырокае распаўсюджванне ў Інтэрнэце, ёю зацікавілася паліцыя. Ліу прадала звыш 7 тысяч копій рамана, а таксама іншых «адкрытых», навэл, пры гэтым зарабіла больш за 150 тысяч юаняў ($ 21 624).

Тэрмін за распаўсюд парнаграфіі Цяны атрымала, як гаворыцца ў пастанове суда, адлюстраваўшы ў рамане «непрыстойныя сэксуальныя паводзіны паміж мужчынамі». Вытворчасць і продаж парнаграфіі ў Кітаі строга забаронены.

Вядомы кітайскі сэксолаг і сацыёлаг Лі Йінх, які мае больш за 2 мільёны падпісчыкаў у Weibo, напісаў: «Аўтар заслугоўвае спагады». І дадаў: «Яна сапраўды парушала крымінальнае права, але нават аднагадовы прысуд занадта вялікі, не кажучы ўжо пра дзесяць».

CNN працытавала юрыста Дэна Сюэпіна, які сцвярджае, што прысуд быў заснаваны на састарэлай судовай інтэрпрэтацыі законаў краіны, датаваных 1998 годам. «Вярхоўнаму суду, магчыма, спатрэбіцца перагледзець справу ў сувязі з судовай інтэрпрэтацыяй», — сказаў ён.

Горад-кніга

Лейдэн — горад у нідэрландскай правінцыі Паўднёвая Галандыя на рацэ Стары Рэйн. А яшчэ становіцца... кнігай.



Яго ведаюць як родны горад вялікага жывапісца Рэмбрандта, а таксама многіх навукоўцаў. Маляўнічы гарадок, які жыў толькі мінулай славай, дзякуючы двум сябрам ператварыўся ў адзін з цэнтраў сучаснай культуры.

Праект Бэна Валенкампа і Яна Браўнса некаторыя называюць арганізаваным і прадуманым, аднак пачынаўся ён стыхійна. Паколькі Валенкамп любіць паэзію, яго засмучае тое месца, на якое ў наш час рацыянальныя галандцы адсунулі вершаваныя радкі, вось ён і вырашыў у 90-х паказаць жыхарам Лейдэна, наколькі прыгожыя тыя вершаванкі.

Вершы, па задумцы Бэна Валенкампа, неабходна было пісаць выключна на мове і алфавіце арыгінала на сценах дамоў горада. І горад паступова стаў ператварацца ў гіганцкі паэтычны зборнік, а самі вершы пакідалі ўражанне мудрагелістага арнаменту.

Першым стаў верш Марыны Цвятаевай «Маім вершам, напісаным так рана...». Домам, на сцяне якога яго напісалі, валодалі знаёмыя Бэна і Яна, таму яны лёгка атрымалі дазвол ад гаспадара, які з'яўляўся да таго ж уладальнікам кніжнай крамы. Атрыманага эфекту не чакаў ні адзін з траіх: у краму «павалілі» рускія турысты, мяркуючы, што вершы з'яўляюцца рэкламай рускай кнігарні. Пазней, зразумеўшы памылку, прызнавалі, што радкі Цвятаевай закранулі ім сэрца, а ў некаторых вершаваныя радкі нават выклікалі слёзы...

Пасля з'яўлення на дамах новых вершаў мясцовыя газеты друкавалі іх пераклады. Так што жыхары горада пазнаёміліся з паэзіяй мноства краін: на гарадскіх сценах можна сустрэць арабскую вязь, японскае хоку, інданезійскі верш і інш.

Агулам аўтары праекта планавалі ўпрыгожыць сцены горада 101 вершам, адбіраючы тыя, што апісваюць ролю паэзіі і паэтаў для чалавецтва і душы, прычым да кожнага выкарыстанага вершам падыходзілі індывідуальна. Апошнім павінен быў стаць верш Федэрыка Гарсія Лоркі, аднак лейдэнцы папрасілі дадаць яшчэ, і вершамі цяпер упрыгожаны 111 сцен.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы novostiliterature.ru, «Ex Libris», CNN, «Новай газеты», «The New York Times», Interfax.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by